Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

КАСТРЫЧНІК 18 1933 г. СЕРАДА. № 230 (4774)

Год выдання XVI

Да XVI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі выканаць не менш 50 проц. фінплана чацвертага квартала

ЦК КП(б)Б і СНК БССР за подпісамі т. т. ГІКАЛО і ГАЛАДЗЕДА паслана тэлеграма ўсім сакратарам РК КП(б)Б і старшыням РВК. У тэлеграме гаворыцца:

— Першая дэкада 4-га квартала ў галіне выканання плана мабілізацыі сродкаў прайшла нездавальняюча, што сведчыць аб поўнай бяздзейнасці раённых арганізацый і асабліва фінансавых устаноў. Паўтараюцца зноў памылкі 3-га квартала, калі на працягу першай паловы не праводзілася ніякай работы па мабілізацыі сродкаў.

— Прапануем абгаварыць на бюро райкома і ў прэзідыуме РВК ход выканання плана мабілізацыі сродкаў першай дэкады, рэгулюючы на ўсякія моманты бяздзейнасці. Да 7 лістапада забяспечыць не менш 50 проц. квартальнага задання. Галоўны ўпор у рабоце неабходна перанесці на выкананне добраахвотных плацяжоў — пазыка, уклады ў ашчадныя касы, пай ў спажывецкую кааперацыю.

Усіх работнікаў фінансава-банкаўскіх устаноў безагаворачна пераключыць на непасрэдную работу па выкананню фінплана. Актывізуйце работу раённага і нізавога друку вакол выканання гэтых задач.

У гэтай-жа тэлеграме ЦК і СНК прапанавалі пасля сканчэння другой дэкады, не пазней 22 кастрычніка, інфармаваць ЦК і СНК аб прынятых практычных мерапрыемствах у выкананні гэтай дырэктывы.

КАНДАЛАКША

НАЧАЛЬНІКУ ЭПРОНА

т. КРЫЛОВУ

Віншуем гераічных работнікаў совецкай падводнай тэхнікі, чырвонасцяжных эпронаўцаў з новым бліскучым працоўным поспехам—пад'ёмам з мора [illegible] дна ледакола «Садко». Гэта ваша перамога, атрыманая ў цяжкіх [illegible]ах халоднай Поўначы, з'яўляецца выдатным узорам большэвіцкай ра[illegible].

СТАЛІН, МОЛАТАЎ, КАГАНОВІЧ, ВАРАШЫЛАЎ, ЯНСОН.

ПЛАН ВЫКАНАН ТОЛЬКІ НА 72 ПРОЦ.

ЗЛАЧЫННА ЗРЫВАЮЦЬ ЗБОЖЖАПАСТАЎКІ ЛЁЗНЕНСКІ, СІРОЦІНСКІ, ДУБРОВЕНСКІ І МСЦІСЛАЎСКІ РАЁНЫ

Зараз-жа поўнасцю выканаць план, забяспечыць найлепшую якасць здаваемага збожжа!

У БЛІЖЭЙШУЮ ПЯЦІДНЕЎКУ ЗДАЦЬ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ

Тэрмін, вызначаны партыяй і ўрадам для выканання плана збожжапаставак, мінуў. Аднак, вынікі трэцяй пяцідзённкі кастрычніка не далі патрэбнага пералома ў ходзе збожжапаставак. Гадавы план выкананы усяго на 72 проц. Прырост за апошнія 5 дзён складае ўсяго 6 проц.

Аб чым сігналізуюць гэтыя лічбы? Аб тым, што многія раённыя арганізацыі, МТС, саўгасы, сельсоветы не здолелі мабілізаваць масы калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў вакол апошніх настаноў партыі, не здолелі так расставіць сілы на рашаючых участках, каб стапчыць усе віды асенніх сельскагаспадарчых работ са збожжапастаўкамі і па-ранейшаму прытрымлівацца чарговасці.

Такія раёны, як ДУБРОВЕНСКІ, ЛЁЗНЕНСКІ, ЗАСЛАЎСКІ, ГАРАДОЦКІ, СІРОЦІНСКІ, СУРАЖСКІ, УШАЦКІ выканалі ўсяго ад 38 да 53 проц. плана збожжапаставак. Гэтыя раёны ўвесь час ганебна цягнуцца ў хвосце. Канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва тут падмяняецца спазнелымі дэкларацыямі, а масавая работа — голым адміністраваннем.

Узяць, напр., ЗАСЛАЎСКІ раён. Ён увесь час не зыходзіць з чорнай дошкі. На 15 кастрычніка Заслаўшчына выканала гадавы план збожжапаставак на 53,6 проц. — прырост за апошнюю пяцідзённку складае ўсяго 10 проц. У раёне ўсё яшчэ панае самазадаволенасць і надзея, што збожжа самацёкам прыдзе на загатоўчыя пункты. Раённае кіраўніцтва сулакойвае сябе тым, што «павінна-ж збожжа пачаць паступаць, куды-ж яно дзенецца». А ў калгасе таксама сядзяць і чакаюць, пакуль збожжа само высахне і пальцам не крануць, каб арганізаваць сушку, абмалот і здачу збожжа.

Кулацкія гаспадаркі ў раёне сабатуюць збожжапастаўкі. Аднак, ніякіх мер уздзейнасці супроць кулакоў раённыя арганізацыі не прымаюць. Аднаасобны сектар зусім ігнаруецца. Растлу мачальнай работы сярод аднаасобнікаў не праводзіцца. Заслаўшчына па-ранейшаму цягнецца ў хвосце і зрывае выкананне гадавога плана збожжапаставак.

За зрыў выканання збожжапаставак ДУБРОВЕНСКІ раён занесен на чорную дошку. Ці паслужыла гэта папярэджаннем для раённых арганізацый? Факты паказваюць, што не. Гадавы план выкананы на 44,5 проц. За апошнія 5 дзён прырост складае ўсяго 5 проц.

Дзе прычыны такіх ганебных тэмпаў?

Аказваецца, у Дубровенскім раёне ўвесь час сядзелі і чакалі ссіца, каб высушыць збожжа, у большасці засіртаванае на полі. Цяпер як раённае кіраўніцтва, так і нізавыя арганізацыі чакаюць... мерозаў і санной дарогі. Раённае кіраўніцтва спасылаецца на недахват людзей і цягавай сілы. На справе-ж у збожжапастаўках Дубровеншчыны панае агіднейшы самацёк. Масавая растлумачальная работа падмяняецца грубым адміністраваннем. У сваёй рабоце раённае кіраўніцтва апіралася на нападзе-чужых людзей і перараджэнцаў з партбілетамі ў кішэні. Нізавы партыйны актыў, партыйныя ячэйкі зусім не былі прыцягнуты да кіраўніцтва збожжапастаўкамі. Вось дзе карэнні гэтага адставання Дубровеншчыны.

ЛЁЗНЕНСКІ раён—самы адстаючы па ўсёй БССР па збожжапастаўках. На 15 кастрычніка Лёзненшчына падзь выканала 38,2 проц. збожжапаставак. За апошнія 5 дзён прырост складае ўсяго 3 проц. У Лёзненскім раёне класавыя ворагі, агенты кулака, не сустракаючы рашучага адпора з боку раённых арганізацый, усе свае намаганні накіроўваюць на зрыў збожжапаставак, працуюць знішаць калгаснае збожжа, знішчаць каштоўнасць працадня, падарваць у масах упэўненасць у заўтрашнім заможным дні калгасніка.

У калгасах «ВІЦЕБСКІ ПРОЛЕТАРЫЙ», «АПОРА СОВЕТАЎ» і інш. збожжа па-шкодніцку абмалочваецца ў сырым выглядзе, зусім не высушваецца. У саломе застаецца ад 30 да 40 проц. зерня, што наносіць калгасам вялікія страты. Сапраўднай барацьбы з падобнымі з'явішчамі, выразнага і рашучага рэагавання на кожны факт, на кожную спробу зрыва выканання абавязкаў перад дзяржавай у раёне пакуль што няма. Раённае кіраўніцтва ліберапічае з яўнымі зрыўшчыкамі збожжапаставак, з агентамі кулацтва.

Практыка перадавых раёнаў, як КАМАРЫНСКІ, АРШАНСКІ, БАРЫСАЎСКІ і СЛУЦКІ, якія ў бліжэйшыя дні завяршаюць выкананне плана збожжапаставак, бязлітасна выкрывае сапраўдныя прычыны адставання многіх раёнаў, якія прабуюць апраўдаць сваю бяздзейнасць спасыланнямі на аб'ектыўныя прычыны, скаргамі на дажджлівае надвор'е, разважаннямі аб цягавай сіле, занятай на зяблеве і г. д.

Сапраўды большэвіцкая арганізацыя збожжапаставак, уключэнне ў жорсткія рабочыя планы брыгад калгасаў, пры якіх выключаюцца ўсякія разважанні аб недахваце людзей і коняй, у сотнях перадавых калгасаў і ў радзе перадавых раёнаў забяспечылі поўнае і своечасовае выкананне першай запаведзі.

Практыка перадавых калгасаў і сельсоветаў перадавых раёнаў павінна зараз-жа быць перанесена ва ўсе адстаючыя. Трэба неадкладна падхапіць ініцыятыву Аршаншчыны, якая паслала буксірную брыгаду на дапамогу адстаючаму Дубровенскаму раёну!

Просты абавязак партыйных і совецкіх арганізацый — дабіцца, каб калгасы і працоўныя аднаасобнікі ў бліжэйшую пяцідзённку выкакалі добрасумленна планы паставак збожжа, каб усё збожжа, якое застаецца пасля выканання абавязкаў перад дзяржавай і ссыпкі насенных фондаў, было правільна размеркавана.

Кожны комуніст, які працуе ў сельсавеце, саўгасе і калгасе, павінен усвядоміць вялікую адказнасць, ускладзеную на яго партыяй. Арганізуючы масы калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў, штодзенна дапамагаючы ім у арганізацыі сушкі і абмалота збожжа, руйнуючы ўсякія праяўленні кулацкага сабатажу, мы можам дабіцца ў бліжэйшую пяцідзённку поўнага выканання плана збожжапаставак.

У барацьбе за збожжа наступілі рашаючыя дні. Падцягнуць адстаючыя раёны і сельсоветы, праверыць планы саўгасаў і калгасаў, арганізаваць сушку збожжа там, дзе яго вільготнасць вышэй кандыцыі, разграміць новыя на неўры класавага ворага, — вось галавая задача, якая паўстае зараз перад раённымі партыйнымі арганізацыямі.

Надыходзіць XVI гадавіна вялікага Кастрычніцкага свята. У дні Кастрычніка ў Мексну адбудзецца 3-ці ўсебеларускі з'езд калгаснікаў-ударнікаў. Задача партыйных і совецкіх арганізацый — шырока разгаркуць спаборніцтва паміж калгасамі на права ўдзела ва ўсебеларускім з'ездзе перадавікоў.

Спаборніцтва з Заходняй вобласцю, спаборніцтва паміж калгасамі БССР паказала, якое яко мае вялізарнае значэнне ў справе мабілізацыі актыўнасці працоўных мас на выкананне пастаўленых партыяй і ўрадам задач перад сельскай гаспадаркай. Ад партыйных і совецкіх арганізацый патрабуецца толькі адно — штодзенна кіраваць спаборніцтвам.

У БЛІЖЭЙШУЮ ПЯЦІДНЕЎКУ ПОЎНАСЦЮ ЗДАЦЬ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ. Шырэй разгарнуць перадкастрычніцкую пераклічку паміж саўгасамі, калгасамі і працоўнымі аднаасобнікамі на поўнае выкананне сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай па пастаўцы сельска-гаспадарчай прадукцыі.

„АБ'ЕКТЫЎНЫЯ" ПРЫЧЫНЫ І САПРАЎДНАСЦЬ

ДУБРОЎНА. (Наш спец. кар.).

У рэзультаце адпаведнай тэлеграмы т. **ГІКАЛО**, з Аршанскага раёна ў Дубровенскі была паслана буксірная брыгада лепшых ударнікаў перадавых калгасаў і сельсоветаў Аршаншчыны.

Арганізацыя буксіра была выклікана самым жыццём. У Дубровеншчыне «без перамен»: на 10 кастрычніка план збожжапаставак быў выкананы толькі на 42 проц. Самыя «перадавыя» сельсоветы раёна ледзь-ледзь перавалілі за 50 проц. (Целяжніцкі, Лёзненскі, Сазонаўскі). Раён у глыбокім тыле збожжапаставак.

Перш чым прыступіць да работы буксірная брыгада, будучы яшчэ ў раённым цэнтры, парапшла выявіць у чым прычына адставання?

Найбольш поўны і вычарпальны ад каз дало пазачарговае пасяджэнне бюро РК з удзелам буксірнай брыгады. На гэтым пасяджэнні прысутнічаў загадчык аргадзела ЦК КП(б)Б т. **КАРТУКОЎ.**

Кіруючыя работнікі Дубровенскага раёна—сакратар РК т. **Кацман**, старшыня РВК т. **Семашка**—імкнуліся ўзваліць усю віну на «аб'ектыўныя» прычыны:

— Няма дзе сушыць снапоў і збожжа; няма на чым перавозіць збожжа на загатоўчыя пункты; там, дзе ёсць ксні—няма вазоў, дзе ёсць вазы—няма коняй; няма добрых дарог. І г. д. без канца.

А больш за ўсё дубровенскія кіраўнікі спасылаліся на адсутнасць «жывых людзей», на слабасць вясковага актыва.

Буксірная брыгада выкрыла поўную беспадстаўнасць усёй гэтай «аб'ектыўшчыны».

«Няма дзе сушыць... А чаму няма? Таму што ў Дуброўне работу адкладвалі «да добрага надвор'я», сядзелі склаўшы рукі і чакалі сонца. У рэзультаце—амаль усё збожжа засіртаванае ляжыць на полі. Калгасы бяшча раскрывае стагі, каб не намоклі, не мацоняць і спакойна чакаюць... марозаў.

А для арганізацыі сушкі збожжа—роўна нічога не зроблена.

«Няма на чым вазіць... А чаму? Прычына зноў-жа ў бяздзейнасці, у чаканні саннага шляха. Асноўная дарога—магістраль, па якой тысячы падвод павінны перавозіць збожжа на пункт—у нецярпімым стане: суцэльныя выбоіны, непралазная грязь. На абочынах гэтай дарогі, і пават па самой дарозе—кучы граўія, а раённікі палец аб палец не стукнулі, каб гэтым матэрыялам (гатовым, на дарозе!) засыпаць калдобіны.

У адным месцы ёсць пераезд праз Дняпро паромам. Там—сотні народа, штурхаціна, арудуюць пайкі хуліганаў, скарыстоўваючы патоўпы і непаразгі. А раённікі не могуць забяспечыць на перавозе добрага парадку, своечасовай пераправы.

Не падлягае сумненню, што асноўнай прычынай адставання раёна з'яўляецца адсутнасць правільнай арганізацыі працы ў калгасах, адсутнасць працоўнай дысцыпліны. Масавыя спазненні на работу калгаснікаў—у раёне звычайнае з'явішча. А чаму? Таму, што работа не арганізавана, што няма сярод калгаснікаў масавага выхаваўчай работы, што зусім слабае партыйнае кіраўніцтва калгасамі.

«Няма жывых людзей»... А што робяць каля 200 комуністаў вясковай арганізацыі, каля 150 комуністаў, што сядзяць у раённым цэнтры, што робяць некалькі соцень комсамольцаў і ўрашце, вясковы беспартыйны актыў?

Калі не нічога, то вельмі мала. У гэта не выпадкова. Не гледзячы на катэгарычныя і зусім выразныя ўказанні ЦК аб перабудове партмасавай работы на вёсцы, у Дубровенскім раёне «воляй» т. Кацмана скасавана рашэнне аб калгасных парторгах і райком зноў «пачаў апіраца» на ўпаўнаважаных па сельсоветах. Такім чынам, кіраўніцтва калгасамі абязлічана, а парторгі, што яшчэ тамсям засталіся, апынуліся на правах «беспрытульных».

Чаму-ж ігнаруецца рашэнне ЦК, чаму зроблен «крок назад»—да ўпаўнаважаных? Аказваецца, у раёне ў свой час, калі былі рэарганізаваны тэрытарыяльныя ячэйкі, былі вылучаны і калгасныя парторгі. Але імі ніхто не цікавіўся, не дапамагаў, не правяраў іх работы. Прайшло некалькі тыдняў і РК КП(б)Б выпадкова заўважыў, што парторгі ў калгасах не працуюць. Тут-жа і парашылі, што рашэн не ЦК Дуброўны не датычыць...

У рэзультаце—няма ні тэрытарыяльных ячэек, няма і парторгаў. Калгасны актыў не арганізаваны. І зараз сакратар райкома т. Кацман скардзіцца на тое, што «няма на каго апірацца». У гэтых «скаргах» тав. Кацман поўнасцю выкрыў асноўную прычыну прарываў:

— І так, вясковая арганізацыя слабая, а тут яшчэ надаспела чыстка партыі і як на зло вычышчаюць старшынь сельсоветаў, калгасаў... Якраз таго, на каго мы ў сваёй рабоце апіраліся(!?).

У чым справа? Што за паклёп па важнейшае мерапрыемства па ўмацаванню партыйных радоў? А можа камісія па чыстцы і сапраўды пруба скажала лінію партыі?

Возьмем савенскую ячэйку. У ёй вычышчаны з партыі старшыня Савенскага сельсовета **Крыўко**, яго намеснік **Кузменкоў**, сакратар ячэйкі **Навумаў** і старшыня калгаса «Ленінскі шлях» **Кірпічэнка.** Хто яны такія, гэта «апора»? Крыўко выключан за п'янкі і сувязь з бандытамі, а іншыя—за разлажэнне, адміністраванне, за зрашчванне з кулаком.

І гэтыя людзі па мове т. Кацмана называюцца «нашаю апораю». Хіба гэта не ёсць прыпуленне класавай пільнасці, праяўленне чыноўніцкага падыхода да такой важнейшай палітычнай справы, як чыстка партыі.

Пасля гэтага становіцца ясна, чаму ў раёне «масавая работа» па збожжапастаўках вымералася колькасцю... выязных сесій, судоў, арыштаў.

Адміністраванне замяніла сабой выхаваўча-масавую работу. Кацманаўскай «апорай» трыкрывалася ў калгасах кулацкая агентура.

Буксірная брыгада была неабходна. Аднак і гэтага не зрозумелі дуброўенскія кіраўнікі, яны пе патрыятвалі належным чынам грамадскую думку ў сельсоветах, каб сустрэць буксір максімальнай мабілізацыяй сваіх сіл.

Аб рабоце буксірнай мы паведамлялі ўжо.

Віт. Даль.

ХОД ЗБОЖЖАПАСТАВАК ПА БССР

НА 15 КАСТРЫЧНІКА Г. Г. (у тонах)

План	Выканана	Проц. вык. гадав. плана	Рост за пяцідзённку
231.652	166.705	72,0	6 проц.

ВЫКАНАННЕ ПЛАНА ПА СЕКТАРАХ

ПА СЕКТАРАХ	Паступіла з пачатку кампаніі	Процант выканання гадавога плана
Калгасы, абслугоўваемыя МТС	20.354	70,2
Калгасы, не абслугоўваемыя МТС	56.120	88,4
Аднаасобнікі . . .	70.746	69,3
Кулакі	1.032	42,2

Па саўгасах і каапгасах план збожжаздачы выкананы на 64,2 проц. натураплаты МТС—на 49,2, вернута насенная пазыкі 55 проц. гадав. плана.

У ЧАКАННІ... СНЕЖНЯ

КЛІМАВІЧЫ. (Ад нашага спецыяльнага карэспандэнта).

«План зяблёва павінен быць выкананы поўнасцю не пазней 10-га кастрычніка» — вось дырэктыва літеньскага аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б.

«Паспеем з зяблёвам. Да снежня яшчэ далёка», — разважаюць ў Клімавіцкім раёне. Для іх дырэктывы партыі неабавязкова.

Калгасы павінны былі ўзяць пад зяблёва 15898 га, а ўзялі толькі 2.670 га — 16,8 проц.

Аднаасобны сектар павінен быў узараць 1.250 га, а ўзараў 251 га — 20,1 проц. Замест 17.148 га па раёну зазяблена 2.921 га — 17,2 проц.

Вось ганебныя рэзультаты апартуністычнай бяздзейнасці, адкладвання зяблёва «на апошнюю чаргу», ляўмення пабольшэвіску спалучыць гэту работу з правядзеннем азімай сяўбы і іншых сельска-гаспадарчых кампаній.

У Клімавічах яўна недаацэньваюць вялізарнай важнасці зяблёва для ўраджаю будучага года.

Пачнем з калгасаў МТС. Вось буйнейшы калгас «**III Інтэрнацыянал**», Асмоланіцкага сельсовета. Ён павінен быў узяць пад зяблёва 775 га, а ўзяў 13 га.

Або калгас «**Перамога**», Гусарскага сельсовета — замест 110 га ўзята толькі 2 га.

Такое становішча ў пераважнай большасці калгасаў зоны дзейнасці Клімавіцкай МТС. Усяго па калгасах МТС павінна быць узята 8.000 га зяблёва, а па 10 кастрычніка ўзята толькі 667 га, або 8,3 проц.

Даводзі аказаць, што з 2.000 га, якія трактарны парк павінен узараць пад зяблёва, на 10 кастрычніка ўзарана ўсяго 206 га, або 10,3 проц.

Трактарныя брыгады больш прастойваюць, чым працуюць. Узяць хоць-бы брыгаду № 6 — 4 трактары. Задание 240 га. А ўзарала брыгада ўсяго 5,3 га.

Дырэктар МТС тав. Бэрын знаходзіць апраўдание слабому ходу зяблёва:

— Бачыце, трактары ў нас зараз заняты на больш важнай рабоце, на малацьбе.

Ці адпавядае сапраўднасці гэты «довад» дырэктара?

Ні ў якім разе. Аб гэтым сведчаць факты і лічбы аб рабоце трактарнага парка на малацьбе. Для прыкладу возьмем брыгаду № 2 Кавалёва. За 10 дзён кастрычніка брыгада мае 130 гадзін працоўнага стояў. Якія прычыны гэтых прастояў? Аказваецца, трактары сталі 24 гадзіны з-за адсутнасці работы, 63 гадзіны пашлі на так званыя «начныя стаянкі», 31 гадзіна на выпраўнасць трактараў і г. л.

Яшчэ больш характэрны прыклад паказвае брыгада № 7 Храмянкова. Гэта брыгада за 10 дзён працавала усяго толькі 224 гадзіны, а прастояў было 584 гадзіны.

Аказваецца, брыгада Храмянкова так сама стаяла з-за «адсутнасці работы». 15 гадзін трактары сталі з-за прагулаў трактарыстаў.

Як-жа пасля гэтага аднесціся да заявы тав. Берына аб тым, што «трактары заняты на больш важнай рабоце»? Выходзіць, што гэта «больш важная работа» заключаецца ў... адсутнасці работы, у прагулах і інш.

Яшчэ больш агіднае становішча ў калгасах, якія не абслугоўваюцца МТС. Калгасы Галіцка-Мыскага сельсовета дагэтуль яшчэ і не збіраліся пачынаць зяблёва. Тое самае і ў калгасах Склімінскага сельсовета. З 480 га ўзята пад зяблёва ўсяго толькі 1 га.

За зяблёва ў Клімавіцкім раёне ніхто не адказвае.

Аб складзе дэлегацыі на III з'езд калгаснікаў-ударнікаў Ленінградскай вобласці

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б

У сувязі з запрашэннем дэлегацыі перадавых калгасаў БССР на III з'езд калгаснікаў-ударнікаў Ленінградскай вобласці, сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Устанавіць колькасны склад дэлегацыі ў 15 чалавек, у тым ліку 5 лепшых калгасных брыгадзіраў, 5 старшынь перадавых калгасаў, 2 ударнікі-рабочыя саўгасаў, па адному спецыялісту (атраному) ударніку з сістэмы НКЗБ і Наркамсаўгасаў.

2. Прадаставіць па адному месцу на III з'езд калгаснікаў-ударнікаў Ленінградскай вобласці для лепшых калгасных брыгадзіраў Дрысенскаму, Аршанскаму, Барысаўскаму раёнам, тры месцы перахоўных сцяг ЦК КП(б)Б, СНК і ЦВК БССР, Полацкаму і Веткаўскаму раёнам, як першым кандыдатам на атрыманне перахоўнага сцяга.

Прадаставіць па адному месцу для старшынь перадавых калгасаў Жлобінскаму раёну, які першым у рэспубліцы выканаў план адгрузкі бульбы Ленінграду; Камарынскаму раёну, які заняў поўнае месца ў БССР па выкананню плана адгрузкі збожжакаставак; паліт аддзелу Рагачоўскай МТС за дапамоўнае выкананне плана па натураплаце.

Уключыць у склад дэлегацыі старшынь калгасаў «Колас», Грабнеўскага сельсовета, Магілёўскага раёна, які атрымаў перахоўны сцяг ад ленінградскага Ікорскага завода, і «9 студзеня»; Дзяржынскага раёна, які атрымаў перахоўны сцяг у калгаса «Колас».

Даручыць т. т. **Пыжыкаву, Бенеку** і **Жолудзеву** падабраць і запвердзіць у склад дэлегацыі двух лепшых ударнікаў-рабочых саўгасаў і па адному спецыялісту (атраному) ударніку ад сістэмы НКЗБ і Наркамсаўгасаў.

3. Прапанаваць райкомам КП(б)Б і паліддзелам, заваяваўшым гапаровае права ўдзела сваіх лепшых калгасаў на III з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў у Ленінградскай вобласці, разгарнуць вакол гэтага палітычна-масавую работу так, каб сустрэць дзень адкрыцця з'езда—15 кастрычніка — лепшымі паказальнікамі выканання гаспадарча-палітычных кампаній.

УСЕБЕЛАРУСКІ РЭЙД ЦКК І „ЗВЯЗДЫ"

У КЛІМАВІЧАХ АГІДНА КІРУЮЦЬ УБОРКАЙ І ПАСТАЎКАМІ БУЛЬБЫ

ДРЭННАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ НА КАПАННІ—АДНА З АСНОЎНЫХ ПРЫЧЫН АДСТАВАННЯ

КАЛІ ЗВОДКА АШУКВАЕ НАДЗЕІ...

Надзеі кожны раз ашукваюць кіраўнікоў Клімавіцкага раёна. З вялікай нецярплівасцю яны чакаюць новай шматгадовай зводкі: можа яна «выратуе» становішча, можа якім-небудзь «цудам» процант ралтам узнімецца да 95-100.

Але «цуда» не прыходзіць. Новая зводка, як і ранейшая, няўмольна ад бівае сапраўднасць. А гэта сапраўднасць—глыбокае адставанне.

Капанне бульбы згодна пастановы бюро ЦК КП(б)Б патрэбна было скончыць «у першы раз да 10 кастрычніка, а подвойнае перавораванне —да 15 кастрычніка».

Тэрміны, такім чынам, прайшлі. Якія-ж вынікі?

Перад намі зводка на 10 кастрычніка. З 9.520 га бульбы па калгасным сектары раёна выбрана толькі 3.312 га—34,8 проц. Па аднаасобным сектары, замест 3.372 га ўбрана 1.018 га—30,2 проц. Дзве трэціх бульбы яшчэ на полі. Вось якая сапраўднасць.

Ганебная заадзяка ўборкі бульбы—рэзультат абсалютнай бяздзейнасці, непаваротлівасці раённых кіраўнікоў. Гэта — рэзультат ніякуды негодзнага кіраўніцтва капаннем бульбы, дрэннай арганізацыі працы на калгасных палях, свядомага адкладвання копкі бульбы з дня на дзень.

У калгасах уборку адкладвалі да «ленінага надвор'я». Чакалі лепшага надвор'я і раённыя кіраўнікі:—«Дзе тут капаць бульбу, калі дажджы».

Але дождж быў тыдзень назад, а «дажджлівыя настроі» ўсё яшчэ не спыніліся, усё яшчэ чакаюць «лепшага надвор'я». Так працягваецца да повага дажджа, і тады ўсё паўтаецца з пачатку...

Вось чаму ў калгасах Малашкавіцкага сельсовета да 10 кастрычніка выкапалі толькі 72 га бульбы, а ацэнена на складзе 228 га яшчэ на полі. У калгасах Радзінскага сельсовета план капання бульбы выкананы на 37,6 проц., Красавіцкага—на 19,4 проц., Галіцка-Мыскага—на 15,2 проц., Студзенецкага—на 13 проц., Звонічанскага—на 27 проц. і г. д.

У аднаасобным сектары яшчэ горш. Тут капанне бульбы пусцілі на поўны самацёк. Сельсоветы і парторгі ячэйкі не цікавяцца нават як убіраюць бульбу аднаасобнікі. Дзесяцідворкі, там дзе яны арганізаваны, фактычна існуюць толькі на паперы, а практычная работа не ідзе. Таму не дзіўна, што ў радзе вёсак Аўтухоўскага, Галіцка-Мыскага, Арлоўскага і іншых сельсоветаў да ўборкі яшчэ фактычна і не прыступілі. У Забялышынскім сельсавеце аднаасобнікі выкапалі ўсяго... 1 га бульбы, у Малашкавіцкім—5 га, у Склімінскім—6 га і г. д. Гэтыя лічбы—сігнал сур'ёзнай пагрозы зрыва ўборкі бульбы, гібелі значнай колькасці прадукцыі.

Адной з актуальных прычын слабых тэмпаў уборкі з'яўляецца ігнараванне бульбакапалак. Ёсць калгасы, якія маюць бульбакапалкі, але свядома праводзяць выкапванне ўручную, ігнаруючы механізаваную працу. Гэтыя антымеханізатарскія настроі расцвітаюць кулацкімі, класава-варожымі элементамі, якія імкнуцца ва што-б там ні стала сарваць уборку. У калгасе «Камінтэрн», Лазовіцкага сельсовета, ёсць дзве бульбакапалкі, але яны не працуюць. Пад розными «матывамі» праўленне калгаса на чале са старшынёю **АЗАРЫНЫМ** імкнецца капаць бульбу ўручную.

У калгасах «Совецкая Беларусь», імя Молатава, «Кастрычнік», «Большэвік» і інш. нават не жадаюць атрымаць бульбакапалкі. Яны вазмуцца на складзе.

Самае горшае, што гэтыя антымеханізатарскія тэндэнцыі не сустракаюць рашучага адпора як з боку сельсоветаў, так і з боку кіруючых раённых арганізацый. Не адзін сабатажнік, ні адзін канкрэтны посьбіт антымеханізатарскіх настрояў не прыцягнут да адказнасці.

Толькі ў рэзультаце агідных тэмпаў капання бульбы мы маем у Клімавіцкім раёне такія-ж ганебныя тэмпы бульбапаставак. На 11 кастрычніка гадавы план паставак выкананы ў раёне на 21 процант. Калгасы выкапалі 28 проц. плана, аднаасобны сектар... 8 проц. Ва многіх сельсоветах у аднаасобным сектары пастаўкі бульбы яшчэ не пачыналіся.

Некалькі слоў аб адгрузцы бульбы і гародніны Ленінграду. Гэту важнейшую работу тармозяць на чарзе як раённыя арганізацыі, так і чыгунка. Некалькі фактаў. На станцыях Клімавічы, Шасцяроўка, Асмоланічы ляжыць каля 300 тон бульбы, якая не адгружаецца з-за адсутнасці вагонаў. На ст. Клімавічы, напрыклад, на працягу 4 дзён не быў падан ні адзін вагон для адгрузкі бульбы і гародніны Ленінграду, а на ст. Асмолавічы —цэлы тыдзень не давалі пераезніка.

У той-жа час загатоўчыя часта не скарыстоўваюць паданыя вагоны. Так, 7 кастрычніка на ст. Шасцяроўка было падана 10 вагонаў, але з-за адсутнасці прадукцыі вагоны не былі нагружаны.

Самым адсталым участкам з'яўляецца **адгрузка гародніны.** Яшчэ не адпраўлена ні аднаго цэнтнера капусты, а трэба адгрузіць 793 тоны; з 15 тон цыбулі, вызначаных планам, таксама не адгружана ні аднаго кілаграма.

С. ГАЛКІН.

КЛІМАВІЧЫ
14-X-33 г.

ДЗЕ ЛОДЫРЫ Ў ПАШАНЕ

БАБРУЙСК. Пастанова бюро ЦК КП(б)Б аб тэрмінах выканання асноўных с.-г. работ не ўзварушыла кіраўнікоў раду сельсоветаў і калгасаў Бабруйшчыны. Уборка бульбы па раёну за цягнулася. Да 10 кастрычніка выкананта 37,9 проц. плана, прычым калгасы ўзралі 50,9 проц.

На прыкладах калгасаў «**Перамога**» (Рымавецкага сельсовета) і «**Чырвоны лётнік**» (Балушэўскага сельсовета) паказжам сапраўдныя прычыны адставання.

Старшыня калгаса «Перамога» **ВАЙЦЭХОВІЧ** упэўнена заяўляе: «Убралі збожжа, справімся і з бульбай». Гэта упэўненасць не мае пад сабой ніякай падставы. З 26 га бульбы ў калгасе выкананта толькі 4. Кожны дзень калгаснікі трацяць шмат часу пакуль даведваецца на чкі ўчастак ісці на работу. Брыгадзір **Бузук** сам пастаянна спазняецца на працу. Звенні на ўборцы не арганізаваны—людзі працуюць гуртам.

А як ахоўваецца выкананая бульба? Яна ссыпаецца ў кучы без усякага ўліку, што дае поўную магчымасць раскрадаць прадукцыю.

У калгасе «Чырвоны лётнік» за 14 дзён выкананта толькі 11 га. Старшыня калгаса **БАНДАРЭНКА** тлумачыць гэта «кліматычнымі ўмовамі»:—«Дрэннае надвор'е перашкодзіла».

Мы зараз пакажам, што сапраўды тармозіць уборку.

9 гадзін раніцы... Калгаснікі сабраліся ў праўленні, прыйшлі «дагаворыцца», ці трэба ісці на працу. Бандарэнка горача ўпрашвае: «Хлопцы, трэба ісці тэмпаць».

Ніхто не рухаецца з месца, глядзяць адзін на аднаго. Пачаліся спрэчкі: каму ехаць, ці трэба наопці капаць у дрэннае надвор'е. Усё-ж такі фашылі выехаць. Выйшлі з жанцылярыі на двор і пачалі разбіраць вёрую. Адзін з праўленцаў завёў гутарку аб рабоце каапераціі, аб дрэнным абслугоўванні калгаснікаў. Яго падтрымалі іншыя калгаснікі. Старшыня зноў угаварае: «Кінеце гутарыць, ідзіце ў поле».

Нарэшце, выехалі. Праз некалькі мінут прыходзіць двое: «Старшыня, а на якіх ўчастак нам ехаць?» Гэта калгаснікі Яропкін і Азарэц, якія пасуд ніколі раней 11-ці гадзін не прыходзяць на працу.

Так паставлена работа ў калгасе «Чырвоны лётнік». Лодыры тут у пашане. Пры такой бездапаможнасці кіраўлення і поўнай адсутнасці працоўнай дысцыпліны можна здзіўляцца, што выкананта нават 11 га.

Зусім абзялічана праца на полі. Брыгады на звенні не разбіты, капаюць гуртам. Нормы паставлена не выконваюцца. Замест 5-ці сотак па норме выкананваюць 2-3. Поле пакрыта непадабранай бульбай. Брыгадзір Алчынскі шчыць гэта «нармальным» з'явішчам.—«Кожная бульбіна не ўчапчы»—апраўдваецца ён.

У калгасе ёсць спраўная бульбакапалка, але яна стаіць на дварэ і іржавее.

Вось чаму вырываецца ўборка ў калгасе «Чырвоны лётнік». У гэтым прычыны адставання і раду іншых калгасаў і сельсоветаў Бабруйшчыны.

М. К.

АД НЯДЗЕЛІ ДА НЯДЗЕЛІ

ПУХАВІЧЫ. Пухавіцкі раён план паставак бульбы выканаў на 52 проц. Ёсць сельсоветы, як Шадкі, Задошчанскі, Дукорскі, Селіцкі, якія ўвесь час цягнуць самыя нізкія паказальнікі.

Раённы камітэт партыі не раз даваў дырэктывы і пастанаўленні аб павышэнні тэмпаў паставак і адгрузкі. Але ён не праверыў выканання дырэктыў, не ўдарыў як належыць па зрыўшчыках кампаніі. Прырост за пяцідзённку на гэтых сельсоветах не перавышае 3-4 проц.

Калгасы і аднаасобныя гаспадаркі здаюць бульбу амаль выключна па нядзелях. Гэта вельмі адмоўна ўплывае на ход паставак. Ужо тры тыдні на нядзелях бывае вялікае скапленне фурэнак на прыёмачных пунктах. Здатчыкам прыходзіцца траціць амаль цэлы дзень з-за вялікай перагружанасці пунктаў. Тым часам у звычайныя дні прыёмшчыкі не маюць нагрузкі.

Замест мабілізацыі насельніцтва на штодзённую здачу бульбы проста з ліпеня на пункты, сельсоветы працуюць ад нядзелі да нядзелі.

Яшчэ горш з адгрузкай бульбы Ленінграду. На станцыях Пухавічы і Рудзенск ляжаць сотні тон бульбы, якая не адгружаецца. Замест 40-50 вагонаў станцыі падаюць па 2-5.

Ніякай увагі не звяртаецца на хаванне бульбы — салома і брызент не загатоўлены, бульба ніякім не прыкрыта.

З. Б.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ВЫКЛІКАНЫ ЧЫСТКАЙ ПАРТЫІ ТВОРЧЫ УЗДЫМ РАБОЧЫХ І КАЛГАСНІКАЎ ЗАМАЦОЎВАЦЬ У ШТОДЗЕННАЙ РАБОЦЕ

ВОПЫТ ПЕРАДАВЫХ ПАРТГРУП—АДСТАЮЧЫМ

(Да менскай гарадской канферэнцыі парторгаў)

Сёння адкрываецца менская гарадская канферэнцыя парторгаў прадпрыемстваў. Значэнне гэтай канферэнцыі вялізарнае. Праходзіўшая ў вытворчых ячэйках чыстка партыі ўзняла актыўнасць рабочых мас. **Замацаванне і ўзняцце гэтай актыўнасці на яшчэ большую вышыню—адна з асноўных задач канферэнцыі.**

Па ранае прадпрыемствах у рэзультаце чысткі ёсць значнае ажыўленне партыйна-масавай работы. Асобныя парторгі ў брыгадах стакі агітацыя, як кіраўнікі і арганізатары барацьбы за выкананне прамфінплана. Узнік, напрыклад, парторгу брыгады страгалёў гарбарні **«Большэвік».** Парторг гэтай групы т. **Запольскі** па кансультацыі сакратароў ячэек і партколектываў па пытанні падрыхтоўкі да канферэнцыі расказваў, што ў рэзультаце правядзення партыйна-масавай работы брыгада дасягла добрых поспехаў у барацьбе за прамфінплан. **У лістені яна выканала вытворчае заданне на 125 проц., у жніўні на 129 проц., верасні на 131 проц. Якасць прадукцыі таксама падвышна.**

Партгрупа т. Запольскага першая па заводзе падхапіла ініцыятыву рабочых **Маскоўскага** электрозавода —скарачэнць прадукцыйна ўсе 420 мінут у суткі—і зараз поўнасцю гэта ажыццяўляе.

А вось партгрупа брыгады рамнічы каў 1-га хромазавага цэха. Брыгада, якой кіруе гэта група на чале з парт оргам т. **Левітам,** таксама сістэматычна з месяца ў месяц перавыконвае прамфінплан. Вытворчае заданне трэцяга квартала яна выканала на 113 проц. **Характэрна, што комуністы ў брыгадзе па выкананні норм ідуць упераздзе, а беспартыйныя рабочыя па іх раўняюцца.**

Аб тым, што партгрупа сапраўды па-большэвіцку кіруе вытворчай работай брыгады, сведчыць яе ініцыятыва ў перагляде нормы на набіўцы скур. Бачачы, што норма 118 скур—зусім нізкая, партгрупа абмеркавала гэта пытанне на сходзе і рашыла выступіць сустрэчную норму—184 скуры. Зараз брыгада гэту норму поўнасцю выконвае і нават перавыконвае.

Узоры большэвіцкай барацьбы за прамфінплан, асабліва за якасць прадукцыі, паказвае партгрупа брыгады крышначнікаў пераплётнага цэха друкарні імя **Сталіна.** Раней у гэтай брыгадзе брак выпускаемай прадукцыі складаў 9-10 проц., а зараз брыгада дасягла яго нізкай аднаго проц.—0,14, і ў гэтым рэзультат работы партгрупы па чале з парторгам т. **Рубінштэйнам.** Партгрупа арганізавала справу так, што ўлік якасці прадукцыі, выпускаемай кожным рабочым, штодзённа правяраецца і тут-жа пасля работы вынікі абгаворваюцца па кароткіх вытворчых нарадах.

Прыклады ўзорнай работы партгруп ёсць і па заводзе імя **Варашылава,** швейнай фабрыцы **«Кастрычнік»,** абутковай імя **Кагановіча** і шм. прадпрыемствах. **Аднак, гэтых прыкладаў, на жаль, яшчэ вельмі мала.** Большасць партгруп, у тым ліку і па вышэйпаказаных прадпрыемствах, далёка яшчэ не працуюць так, як трэба. **Можна сустрэць і такія групы, якія лічацца толькі фармальна, а па суткасці ў брыгадзе яны не адчуваюцца, як кіраўнікі і арганізатары вытворчага і партыйнага жыцця.**

Вось чаму перанясенне станоўчага вопыту перабудовы партыйна-масавай работы на тыя прадпрыемствы, дзе становішча пасля чысткі не змянілася, набывае зараз асабліва важнае значэнне. І канферэнцыя парторгаў у гэтых адносінах павінна адыграць вялікую арганізуючую і мабілізуючую ролю. На канферэнцыі павінны быць прааналізаваны формы і метады работы лепшых і горшых партгруп, выяўлены прычыны, чаму адны працуюць добра, а другія дрэнна, каб на гэтай аснове выпрацаваць практычныя мерапрыемствы, якія забяспечваюць рашучы пералом у ажыццяўленні дырэктыў правяраючых камісій па чыстцы, па ўмацаванні нізавога партэвяна.

Другое, вельмі важнае пытанне, якое павінна быць ва ўсю шырыню пастаўлена на канферэнцыі—гэта **замацаванне партыйна-масавай работы партгрупай унутры самой брыгады.** Ёсць брыгады, якія надрэзна выконваюць вытворчыя заданні, і ў той-жа час партыйна-масавая работа ў іх праводзіцца слаба. Гэты факт сведчыць аб тым, што пры разгортванні партыйна-масавай работы можна дабіцца значна большых поспехаў. Парт групы-ж, цэхавыя ячэйкі і партколектывы супакойваюцца на дасягнутым.

— Раз план брыгадай выконваецца—можна чуць ад асобных парторгаў і сакратароў ячэек—**значыць партгрупа працуе добра.**

Бясспрэчна, выкананне брыгадай вытворчага задання з'яўляецца паказальнікам вялікай станоўчай работы партгрупы. Але браць гэты паказальнік адарвана ад разгортвання партыйна-масавай работы ў брыгадзе ні ў якім разе нельга. **Аб работе партыйнай групы трэба меркаваць не толькі па рэзультатах выканання прамфінплана, але і па разгортванні палітыка-выхаваўчай работы сярод рабочых, па тым, як група своячасова і правільна даведзіць да рабочых важнейшыя пастановы партыі і ўрада, як партгрупа скарыстоўвае ўсе вытворчыя магчымасці, якія ёсць у наяўнасці, каб дабіцца максімальных поспехаў.**

Трэцяе пытанне, якое таксама павінна быць завострана на канферэнцыі—гэта замацаванасць партгрупы ў штодзённым жыцці кожнага рабочага, чулы падыход яе да запатрабаванняў рабочых.

Вось асноўныя пытанні, якія павінна вырашыць канферэнцыя парторгаў для таго, каб умацаваць баяздольнасць нізавога партэвяна.

Р. Фралоў.

Агляд друку

ГУЛЬНЁЙ У „БУКСІРЫ" ПРЫКРЫВАЕЦЦА БЯЗДЗЕЙНАСЦЬ

„МАЯК КОМУНЫ", БЫХАЎ

У газеце так і надрукавана:

— На трыбуне тав. Мааграў...

— На трыбуне работніца Рудкоўская Ганна...

— А вось на трыбуне другія людзі...

— Адзін за адным праходзяць комуністы...

Што гэта—парад? Агляд? Не. Гутарка ідзе аб чысткі партыі. Але ў быхаўскай газеце «Маяк комуны» чыстка партыі выглядае іменна парадам.

Перад намі нумар ад 3 кастрычніка. У ім змешчана вялікая кароткая дакладная аб чысткі ячэйкі гуты «Ільіч». Першыя дзве калонкі заняты пералічэннем прозвішч і біяграфій комуністаў. Праўда, аб Арлове сказана, што ён

«... хронікерскі (?! — Рэд.) пералічвае ўсе свае пасады, але аб тым, як ён на справе змагаўся за генеральную лінію партыі, аб гэтым ён ні слова не сказаў».

А далей? Ці гаворыць газета, як ён, Арлоў, змагаўся за генеральную лінію партыі? Нічуць. Выклала біяграфію і паставіла крыжку.

У астатніх двух калонках гэтай карэспандэнцыі гаворыцца аб вельмі злосным, амаль аб усім, і вельмі цяжка ўявіць, што асноўнае, галоўнае. Мыслі ў карэспандэнцыі як-бы расіяе кажуцца, няма стрыжнявой, фіксуючай увагу чытачоў.

Возьмем нумар **«М. К.»** ад 10-га кастрычніка. У гэтым нумары паведамляецца аб зрыве першых сходаў па чысткі ў ячэйках металістаў і асветнікаў. Правільна даецца ацэнка гэтым зрывам і ўскрываюцца іх прычыны. Але ледзьвацыя і тут не ўнікнула шаранаміі. Яна сямнічае ліст ячэйкі райкіраўніцтва міліцыі, якая фашыла ўзяць на буксір «ячэйкі мета лістаў і асветнікаў», г. зн. тыя самыя ячэйкі, у якіх сарваліся першыя сходы па чысткі.

Па-першае, аб буксіры. Што значыць узяць на буксір ячэйку пры чысткі партыі? Што гэты буксір бу дзе рабіць? Над гэтымі пытаннямі не падумалі ні ячэйка міліцыі, ні рэдакцыя, змясціўшыя гэта вынаходства ў газеце.

Па-другое, чаму іменна ячэйка міліцыі бярэ на буксір, калі яна сама нічога не робіць? У пастанове Быхаўскага райкома (змешчаным у тымжа нумары «МК» ад 10 кастрычніка) сказана: «Сакратару парт ячэйкі кіраўніцтва райміліцыі тав. Лейздруту ўказаць на недапушчальнасць не выканання да гэтага часу указанняў даных камісіяй па чысткі».

Парадняцць гэтага самаабвязацельства відавочна. А вось як выглядае другое самаабвязацельства:

«Прысці да чысткі кашай ячэйкі з поўнай ліквідацыяй маючыхся недахопаў у рабоце райкіраўніцтва міліцыі».

Да чаго абавязвае такое самаабвязацельства, у якім няма нічога канкрэтнага і практычнага?

Як бачым, ні ячэйка міліцыі не цуміла над сваёй творчасцю, ні рэдакцыя «МК» не думала, калі змясціла ў газеце гэтую творчасць.

Гэта-ж дэкларацыйнасць, гульня ў буксіры, за якою хаваецца бяздзейнасць.

Чыстка дае надзвычай роснастайны матэрыял. Чыстка ўскрывае вельмі шмат фактаў. Задача газеты не ў тым, каб фіксаваць факты, але даць ім аналіз, ускрыць іх класавую, палітычную сутнасць, паказваць высокае палітычнае значэнне чысткі. «Маяк комуны» часта падносіць чытачу факт, ускрыты чысткай, але не дае яму ацэнкі. А калі і дае, дык агульна, абязлічана. Так, напрыклад, яна ў нумары ад 13 кастрычніка гаворыць аб круговай паруцы ў ячэйцы металістаў.

«... рад комуністаў правялі пры тупленне класавай пільнасці і прымірэнцкія адносіны да класава чужых элементаў».

Хто прымірэнча адносіўся, у каго прытупленне класавай пільнасці — гэта засталося невядомым.

У другім месцы газета сцвярджае, што ячэйка прымірэнча адносіцца да сімпатыкаў, бундаўскіх і іншых нацыяналістычных элементаў. Зноў такі галаслоўны, бо нічым газета не дакажае прымірэнцтва ячэйкі.

Усё гэта паказвае, што «Маяк комуны» асвятляе чыстку партыі па метаду **«цап-ляп»,** не ўдумваючыся ў сутнасць асобных фактаў і з'яў, не звязваючы кашцоў з кацамі, і тым самым зніжае палітычнае значэнне чысткі.

Узмацняецца работа партыйна-комсамольскага ядра

СЛУЦАК. (Ад нашага спецкора). Слуцкі РК КП(б)Б і палітаддзел адным з першых на Беларусі практычна рэалізавалі пастанову ЦК УсеКП(б) аб калгасным партэвяёнцы. **«Звязда»** пісала ўжо аб вопыце работы некаторых калгасных ячэек Слуцкага раёна ў часе ўборкі. Гэта быў першы перыяд, калі рэарганізацыя яшчэ не была скончана. За апошнія два месяцы праведена велізарнейшая работа. З 55 калгасаў 53 забяспечаны парткіраўніцтвам.

Найбольш яркія ўзоры работы падаваму паказвае нова-арганізаванае партыйна-комсамольскае ядро ў калгасе **«Новае жыццё»,** які зараз з'яўляецца адным з лепшых калгасаў у сістэме Слуцкай МТС.

Партыйна-комсамольскае ядро калгаса «Новае жыццё» паказвае высокая якасныя ўзоры масавай работы ў полі. У часе ўборкі на полі былі ўстаноўлены чырвоныя і чорныя дошкі. Першыя дні на чорнай дошцы «красаваўся» 5 прозвішчаў, сярод іх былі і прозвішча **Гурбо Хомы**—шматлікага жнівярскі, які не выконваў норм жніва. Партыйна-комсамольскае ядро прымацавала да Гурбо комсамольца, і ён узяў Гурбо на грамадскі буксір. Дзякуючы гэтаму, Гурбо стаў лепш падрыхтоўваць машыну да работы, перастаў рабіць частыя астаноўкі і, нарэшце, з «чарапахі» перасеў на «самалёт»: яго жнівяра жала 5,9 га за змену — рэкордная ліква.

Праз пяцідзённую чорная дошка стала пустой, затое па 10 чалавек было на чырвонай дошцы. У брыгадах няма ні аднаго прагульшчыка, усе калгаснікі выконваюць нормы работы. Делегатка ўсебеларускага з'езда калгаснікаў-ударнікаў **Пьюк Надзя** — так арганізавала работу свайго звяна яна вальшчыц, што за жнівяржай вязалі снапы 5-6 чалавек замест 8 па норме. Яе звяно выпрадоўвала на 2 працадні на кожнага работніка ў адзін дзень.

Кіямовіч Арына ўпачаткавала звяно ручных жней. Яна стаборнічала са звяном вязальшчыц Пьюк Надзі. Арына дабілася, што яе звяно выжывала на норме.

У результаце ўдарнай работы ўбрана жыта ў калгасе «Новае жыццё» была закончана на працягу 5 дзён у самае лепшае сухое надвор'е.

— Мы галоўную ўвагу аддаем замацаванню брыгады і асабліва брыгадзіра звяна — кажа нам начальнік аддела тав. **Сташэвіч.**

Рэзультаты кажуць, што палітаддзел і тут дабіўся рэзкага паляпшэння. У калгасе **«Шляхі калектывізацыі»** арганізаваны пад кіраўніцтвам лепшых ударнікаў звенні па 2-5 чалавек (у залежнасці ад работы). Гэта спрыяла ліквідацыі ўраўніўкі і максімальна ўзняло прадукцыйнасць працы. Веснавую сяўбу калгас закончыў да 12/V, на 20 дзён раней тэрміна ўсялу папары, датэрмінова праведзеў праполку. Гэты калгас узорна без страт правёў уборку збожжавых і за раз закатчвае і зябліва і ўборку буль бы.

Асабліва вялікая заслуга комсамольцаў у ахове соцыялістычнай маемасці.

Паказальнікі работы апошніх месяцаў наглядна паказваюць, паколькі на 0,16 га на работніцу замест 0,10 кі правільна і своячасова было разнесці по партыі аб перабудове партработы на вёсцы.

П. Арцельны.

ФАБРЫКА „ГЕРОЙ ПРАЦЫ" КОЖНЫ ДЗЕНЬ НЕДАДАЕ КРАІНЕ ДЗЕСЯТКІ ТОН ПАПЕРЫ

Ушчыльненнем рабочага дня, поўнай загрузкай варштатаў сустрэнем свята Кастрычніка

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЯ ВЫТВОРЧАЯ ПЕРАКЛІЧКА

АПЛАЦІЦЬ СОЦРАХУНАК ПАЛЕСДРУКУ

Добрушская фабрыка «Герой працы» мае ўсе ўмовы быць у перадавых радах барацьбітоў за поўнае і добраякаснае выкананне прамфінплана — давать штодзень пролетарскай дзяржаве 100 тон паперы.

Тым часам, фабрыка ў першым квартале выканала прамфінплан толькі на 57,4 проц. — недадала дзяржаве 3.470,9 тон паперы.

У пачатку другога квартала фабрыка таксама заставалася ў прарыве. Калі на фабрыцы працавала брыгада ЦК КП(б)Б на чале з тав. **Жэбрэўскім** і правяла ўсе неабходныя большэвіцкія мерапрыемствы, фабрыка за другі квартал дала 6.255,4 тоны паперы — 103,4 проц. квартальнага задання.

Ужо адно гэта гаворыць аб тым, што «Герой працы» мае ўсе неабходныя ўмовы для выканання сваёй вытворчай праграмы.

Дабіўшыся ў другім квартале выканання і перавыканання прамфінплана па колькасных паказальніках, большэвікі Добруша павінны былі замацаваць вопыт барацьбы і ў трэцім квартале таксама выйсці пераможцамі, узмацніў ны барацьбу за якасць, за поўнае выкананне асартымента паперы.

А што аказалася на справе? Фабрыка з першых-жа дзён 3-та квартала пачала здаваць тэмпы.

Так, за чэрвень месяц план выканан на 82,2 проц., за жнівень — на 67,5 проц. і ў верасні — на 55,4 проц. Што дзень фабрыка недадае дзесяткі тон паперы. Вось, напрыклад, 29-IX замест 100 тон паперы фактычна яна дала толькі 75,38 тоны. У гэты дзень шостая машына, якая дае ў тры змены 42 тоны паперы, прастаяла на першай змене 3 гадзіны з прычыны прамыўкі сеткі, на другой—2 гадзіны з-за нядбайных адносін да сваіх абавязкаў работніцы Жылінскай Ганны.

Чаму «Герой працы» так ганебна зрывае прамфінплан?

Першая і галоўная прычына — адсутнасць распарадкальнасці, нанёўнасць дробна-буржуазнай расхлябанасці сярод асобных адсталых рабочых і нават сярод кіруючага склада фабрыкі.

Возьмем, напрыклад, такі факт. Дырэктар фабрыкі, пасхаўшы на 4-5 дзён за сям'ёй, прабыў там 21 дзень. Гэта ў той час, калі фабрыка знаходзіцца ў глыбокім прарыве.

Другая прычына — цякучасць рабочай сілы. Вось даныя за 8 месяцаў 1933 года. На фабрыку паступіла рабочых 1.432 чал. і кінула — 1.335 чал., ІТР паступіла 48 чал. і выбыла 65 чал.

Чаму на фабрыцы такая празмерная цякучасць? Прычына вусім простая. Аддзел кадраў фабрыкі працуе старымі метадамі. Набор рабочай сілы праводзіцца самацёкам, а таму на фабрыку часта трапляюць дэзарганізатары вытворчасці.

Нова—прынятыя рабочыя пасылаюцца ў цэх і іх там сустракаюць па-галавацяпску. Іх не ставяць на адпаведнае месца, не вучаць іх. Начальнікі цэхаў, дзхкомы, дохпарт'ячэйкі вусім не клапоцяцца аб стварэнні для іх таварыскіх умоў працы, аб забеспячэнні харчаваннем, аб прымацаванні да крамы і забеспячэнні кватэрамі. У выніку гэтага новапаступаючыя на фабрыку па некалькі дзён бадзяюцца без сталоўкі, без месца для начлега і вымушаны, на рэшце, кідаць працу.

Трэцяя прычына прарываў — адсутнасць барацьбы за своячасовую падачу палёва. Не гледзячы на існуючую тарфяную базу і механізаваную падачу на лёва, апошняе падаецца з вялікімі перабоямі і ў рэзультаце машыны прастойваюць цэлыя змены. Неабходна дадаць сюды і адсутнасць барацьбы за своячасовую выпрацоўку целюлозы. Саламяна-цэлюлозны завод, які знаходзіцца ў распараджэнні фабрыкі, як і торфазавод, працуе вельмі дрэнна.

Завод 6-за несваячасовай падачы саломы вымушан стаяць. Тым часам для хуткай і бесперабойнай падачы саломы патрабуецца пракласці толькі каля 10 метраў шляха і справа будзе наладжана. Аб пракладцы гэтага шляха працяжнасцю ў 10 метраў гаворыцца ўжо на працягу года. Гаворыць на вытворчых нарадах, на парткоме, на злётах ударнікаў, на нарадах трыкуэнікаў, а солома як і раней дастаўляецца вялікрутасамі, і завод зноў прастойвае, замест 30 тон целюлозы ў суткі дае 22, максімум — 27 тон.

Чацвертая прычына зрыва прамфінплана — адсутнасць сапраўднага, глыбокага разгортвання соцспаборніцтва на фабрыцы ва ўсіх цэхах, на кожным вытворчым участку. Нельга сказаць, што соцспаборніцтва і іншыя формы масавай работы не праводзіцца, але ў радзе цэхаў яно праводзіцца адарвана ад канкрэтных задач выканання плана.

Возьмем такі важны ўчастак работы, як арганізмасавая перабудова работы партгруп і работы шматтыражнай газеты **«Чырвоная Бракамолка».** Партыйныя групы асобных цэхаў зусім не працуюць, за іх работу ніхто не адказвае. Арганізмасавы работнік тав. **Лебедзеў** на бюро парткома не так даўно справаўся з сакратаром парткома т. **Рындзічам,** што ён (Лебедзеў) за арганізацыю партгрупы не адказвае, бо ён агітмас. Адсюль відаць, што гэтая важнейшая партработа на фабрыцы прапалена. Абязлічка ў работе, адсутнасць плановасці — нічога іншага і не магла даць.

«Чырвоная Бракамолка», як калектыўны пропагандыст, агітатар і арганізатар мае павінна была паказаць узоры барацьбы за прамфінплан кожнага цэха, кожнага агрэгата і прадпрыемства ў цэлым. Усе ўмовы для гэтага газета мае. Ёсць свая друкарня, свая папера і ўсё неабходнае для баявой работы газеты. Але-ж газета **«Ч. Б».** на чале з редактарам т. **Рабіковічам** (які чамусці лічыць ніжэйшай для сябе пматтыражку), не відзе сістэматычнай, прапагандысцкай і партмасавай работы на канкрэтных участках, вельмі часта плянуецца ў хвасце і штампуе ўжо адбылыя факты.

Асабліва вялікім недахопам у работе **«Ч. Б.»** з'яўляецца тое, што газета ніколі не даводзіць да канца ўзнімаемых пытанняў. На фабрыцы можна чуць гутаркі, што «газета толькі піша, піша без канца, а праверыць, як рэагуюць на пісанне — гэтага ў газеце няма». І яшчэ адзін з бучных недахопаў газеты—гэта поўнае ігнараванне лістоў рабочых і работніц. Лісты публікуюцца ў редакцыі, няма ніякага ўліку іх, ніхто не адказвае за іх. Таму не дзіва, што рабочыя і работніцы скарджацца: «мы пішам у газету, а адказа нам ніхто не дае і лісты нашы не друкуюцца».

Газета вельмі мала паказвае лепшыя ўзоры работы асобных цэхаў і ўдарнікаў. Такія лепшыя ўзоры на фабрыцы ёсць, ёсць і героі, ёсць і лепшыя ўдарнікі.

Фабрыку **«Герой працы»** выклікалі на спаборніцтва ўдарнікі **Палесдруку** і патрабавалі ад рабочых фабрыкі **«Герой працы»** у часе перадкастрычніцкай перакліччы ліквідаваць ганебны прагаў. Гэты выклік на фабрычным мітынгу рабочыя прынялі, узялі абавязак **да свята Кастрычніка дабіцца пераможці — штодня давать не менш 100 тон добраякаснай паперы.**

Гэтая перамога знаходзіцца ў руках фабрыкі. Рабочыя **«Герой працы»** могуць выканаць узятыя абавязкі. **Толькі неабходна ад слоў перайсці да канкрэтных дзеянняў,** пераварыць перадкастрычніцкую перакліччу ў дні баявой работы кожнага цэха, кожнага агрэгата, кожнага работніка ІТР і ўсяго калектыва рабочых фабрыкі. **Умовы для гэтага ёсць і перамога павінна быць за рабочымі.**

А. МАРОЗ.

СУРЁЗНА ЎЗЯЦЦА ЗА ЎШЧЫЛЬНЕННЕ РАБОЧАГА ДНЯ

На Магілеўскім заводзе імя **Сталіна** ў парадку падрыхтоўкі да XVI-й гадавіны Кастрычніка праводзіцца вельмі важнае мерапрыемства — тэхэкзамен. Тэхэкзамен у зольным цэху праводзіўся два дні і паказаў, што асноўная маса рабочых добра знаёма з тэхналагічным працэсам вытворчасці. Аднак, маюцца і такія рабочыя **(Карасёў, Падгарэнніказа),** якія не ведаюць самых элементарных момантаў вытворчага працэса і, безумоўна, даюць у працы брак.

Тэхэкзамены ў зольным цэху выклікалі вялікую актыўнасць сярод рабочых да авладання тэхнікай. У аддзе лачным цэху, дзе таксама хутка пачнецца тэхэкзамен, рабочыя ўзяліся па сапраўднаму на тэхвучобу.

Адным з галоўнейшых пунктаў у правядзенні масавай тэхнічнай вучобы з'яўляецца ўшчыльненне рабочага дня.

На заводзе гэты ўчастак работы яшчэ не заняў належнага месца. Фатаграфія рабочага дня красамоўна сведчыць, якія вялікія рэзервы трацяцца ад непрадукцыйнага скарыстання рабочага часу.

Вось фатаграфія рабочага дня шлігоўшчыка **Сіпакова:** паломка інструментаў, прастой — 3 мін., курэнне — 15 мінут, нічога не рабіў — 3 мінуты, пачаў работу са спазненнем на 59 мінут.

Такім чынам, замест 7 гадзін ён працаваў толькі 5,56 гадзіны. Або возьмем другі факт. Рабочы па згоны шпрэлі: паломка машыны, прастой 40 мінут, перарыў — 18 мінут, пазней пачаў працаваць — 32 мінуты, курэнне — 5 мінут, не працаваў —20 мінут. У выніку — 114 мінут рабочага часу страчана непрадукцыйна.

Гэтыя два прыклады кажуць аб тым, што адміністрацыйна-тэхнічны персанал, прафесіянальныя і партыйныя арганізацыі яшчэ не ўзяліся сурёзна за ўшчыльненне рабочага дня.

Н.

РАУНЯЦЦА ПА АГРЭГАТУ т. ПЕУЗНЭРА

Швейная фабрыка імя **Валодарскага** не выходзіць з пласаў прарываў па выкананні прамфінплана як па колькасных, так і асабліва па якасных паказальніках.

За першае паўгодзе прамфінплан выканан на **94 проц.,** за лінень і жнівень на **59** проц. Верасень таксама дае мізэрныя рэзультаты,—прамфінплан з 1 па 25 верасня выканан толькі на **71** проц. **Фабрыка ў гэтым месяцы не дадала краіне на 1,5 мільёнаў рубл. прадукцыі.**

З якасцю выпускаемай прадукцыі справа яшчэ горш. З 1 па 25 верасня з **108158** адзінак брака **7090** адзінак, што складае **6,55** проц., у тым ліку тэкстыльнага—**4,66** проц.

Першае месца па выпуску брака займае агрэгат Баскіна, які за гэты перыяд даў **10** проц. брака. Услед за ім ідзе агрэгат **Дворкіна,** які таксама за гэты час даў 7,17 проц. брака.

Гэтыя-ж агрэгаты найбольш адстаючыя ў выкананні прамфінплана і па колькасных паказальніках. Агрэгат **Баскіна** з 1 па 25 верасня прамфінплан выканаў на **87,6** проц. і агрэгат **Дворкіна** на **78,4** проц.

Яшчэ горш справа стаіць з выкананнем прамфінплана за апошнюю пяцідзённку. З 20 па 25 верасня план выканан толькі на **60,2** проц.

Для паспяховага выканання прамфінплана швейная фабрыка мае ўсе ўмовы. Аб гэтым гаворыць лічбы выканання прамфінплана агрэгатам т. **Пеўзнера,** які даў **100,1** проц. плана і не даў ні аднаго процента брака. Такія-ж умовы для работы маюць усе агрэгаты фабрыкі.

Ганебныя лічбы выканання прамфінплана гаворыць аб тым, што дырэкцыя, партыйная і прафсаюзная кіраўніцтва фабрыкі не займаюцца ўлікоўкай сістэматычнай работай у цэхах і агрэгатах з рабочымі, а толькі выносяць розныя дэкларацыйныя пастановы.

Бюро партколектыва (сакратар **Гольдзін**) не зрабіла належных высноваў з пакаранняў камісіі па чысткі партыйнай арганізацыі фабрыкі і не забяспечыла апаратыйнага большэвіцкага кіраўніцтва кожным цэхам і агрэгатам.

Недобра па фабрыцы і з рабочай сілай. Наглядаецца вялікая цякучасць яе. За адзін трэці квартал прынята на фабрыку 498 чал., а звольнена **503** чал.

Гэта паказвае, што на фабрыцы няма ніякай работы з нова-прымаемымі рабочымі. Партмасавай і культвыхаваўчай работы ў цэхах швейнай фабрыкі не вядзецца.

Фабрыка ўступае ў 4 квартал з вялікім прарывам па выкананні прамфінплана. Задача партколектыва і фабкома перабудаваць сваю работу так, каб кожны цэх і агрэгат былі забяспечаны большэвіцкім кіраўніцтвам. Спусціць ў. цэх, агрэгат і там разам з інструктарамі і лепшымі ўдарнікамі знішчыць усе непаладкі, якія тармозяць паспяховае выкананне прамфінплана.

Толькі пры такой рабоце партколектыў і фабком змогуць дабіцца большэвіцкіх вынікаў у барацьбе за паспяховае выкананне прамфінплана да XVI гадавіны Кастрычніка і гэтым забяспечаць паспыхку сваіх делегатаў на раённы злёт ударнікаў якасці.

МАГ.

Агурскі

НАЦДЭМАУСКАЯ ФАЛЬСІФІКАЦЫЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ*)

У бурныя дні Кастрычніка ўсе дробна-буржуазныя соцыялістычныя партыі былі супроць Кастрычніцкай рэволюцыі і супроць таго, каб менскі Совет узяў уладу ў свае рукі. У кастрычніцкі дні беларускія нацыяналісты выступілі супроць рэволюцыі. 27 кастрычніка Беларуская соцыялістычная грамада і ўсе іншыя беларускія нацыяналістычныя групы выпусцілі маніфест, у якім заяўлялася, што «ваяла апарэхіі (Кастрычніцкая рэволюцыя) не павінна перапяцяць вялікай і значнейшай справе нацыянальнага вызвалення Беларусі».

Грамада ў часе Кастрычніцкай рэволюцыі прадстаўляла сабою зусім вызнаўчы палітычны фактар. Таксама, як у першыя дні лютаўскай рэволюцыі, **яна не мела прадстаўніцтва не толькі ў менскім Совеце, але і ў гарадской думе.** Ведаючы сваю слабасць, БСР у часе выбараў у менскую гарадскую думу блакавалася з украінскай партыяй соцыялістаў-рэвалюцыянераў, з украінскімі эсдэкамі, з поалей-сіяністамі, з аб'яднаннем яўрэйскай соцыялістычнай партыяй (СС) і з беларускай партыяй соцыялістаў-народаўцаў. Гэты блок нашоў над спісам № 2. Лозунгам гэтага блока было: «Калі вы хочаце ажыццяўляць ваны сацыяльныя запатрабаванні і лепшыя нацыянальныя ідэалы, галасуйце за спіс нацыянальна-соцыялістычнага блока, за спіс № 2».

Група буржуазнай і дробна-буржуазнай інтэлігенцыі склікала ў канцы снежня «ўсебеларускі кангрэс», выступіўшы супроць Кастрычніцкай рэволюцыі і супроць совецкай улады. Кіруючаму органу совецкай улады Заходняй вобласці — Совету Народных Камісараў Заходняй вобласці, які знаходзіўся ў Менску і ведаў аб усім нізнаным уплыве беларускіх нацыяналістаў у самой Беларусі, нічога не заставалася рабіць, як распусціць гэты шавіністычны контрреволюцыйны «кангрэс», у якім Беларуская соцыялістычная грамада адыгрывала галоўную ролю. Пасля роспуску кангрэса яго кіраўнікі стварылі нелегальны выканком, які працаваў нелегальна да эвакуацыі совецкіх войск. Як толькі совецкія войскі пакінулі горад, выканком з'езда стварыў Беларускую Раду, кіраўнікі якой зараз-жа паслалі прывітальную тэлеграму кайзеру Вільгельму з падзякай «за вызваленне Беларусі з-пад большэвіцкага ярма». Пад гэтай тэлеграмай таксама быў подпіс прадстаўніка Беларускай грамады. Такую ролю адыгрывала грамада з лютага 1917 года да сакавіка 1918 года.

А вось як Ігнатоўскі і Жылуновіч асвятляюць ролю беларускай контр-рэволюцыі ў перыяд з лютага да кастрычніка. У вышэйпамянёнай кнізе «Беларусь» Ігнатоўскі піша: «Усходняя частка Беларусі, як і ўся Расія, перажывала эпоху шматлагоддзя Керэнскага. У Менску стварыўся Беларускі цэнтральны камітэт, які стаў на чале беларускага нацыянальнага руху. У чэрвені 1917 г. камітэт склікаў з'езд беларускіх арганізацый, які выбраў цэнтральную раду беларускіх арганізацый, якая і прабавала аб'яднаць беларускі нацыянальны рух.

Урад Керэнскага быў паховам вялікай Кастрычніцкай рэволюцыяй. У Беларусі Кастрычніцкая рэволюцыя сустрэлася з нацыянальным пытаннем. Прыцыцы адзінага класавага фронта сустракаецца з прыцыпам адзінага нацыянальнага фронта. Нацыянальныя беларускія арганізацыі склікалі ў снежні 1917 г. усебеларускі кангрэс, на які з'язджаліся 1872 дэлегаты. Гэты кангрэс быў пазбаўлен комуністычнага кіраўніцтва. Ён вынес такую рэзалюцыю. З аднаго боку ён прызнаў вярхоўнай уладай у Беларусі ўсебеларускі совет сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў, але ў той-жа час Беларусь абвяшчаў дэмакратычнай рэспублікай. Месцо вай совецкай улады ў асобе абласнога выканаўчага камітэта Зах. фронта і яго камісараў кангрэс не прызнаў. Пасля гэтага ён быў распушчан «Облискомзапом». Совет кангрэса паразшыў сябе паўнотаю делегатамі ад земства і пашоў у падполе. Нацыянальны рух у Беларусі, такім чынам, адарваўся ад сацыяльнай рэволюцыі». [1])

З гэтай адзінкі лютаўскай і Кастрычніцкай рэволюцыі ў Беларусі зусім ясна тэндэнцыя да замазвання контр-рэволюцыйнага характэра беларускіх «сацыялістычных» партый у перыяд Кастрычніка. Характэрна, што ў эпоху керанскіцкіны Ігнатоўскі бачыць у Беларусі толькі дзве сілы — беларускі нацыянальны камітэт і беларускі нацыянальны рух, якім гэты камітэт кіруе. Аб большэвіцкіх сілах, адыгрываўшых такую вялізарную ролю ў Беларусі і на Заходнім фронце, і аб гераічнай барацьбе, якую вялі большэвікі Беларусі супроць контр-рэволюцыі, скансалідаваній у штабах Заходняга фронта, аб вялізарным уплыве большэвіцкай партыі на рабочых і сялян Беларусі, — аб усім гэтым Ігнатоўскі не знайшоў патрэбным успамянуць ні слова.

Далей, паводле Ігнатоўскага, у кастрычніцкія дні ў Беларусі сутыкнуліся два прынцыпы—прынцып адзінага класавага фронта з прынцыпам адзінага нацыянальнага фронта. Аб тым-жа, як нацыянальны «прынцып», г. зн. беларуская нацыяналістычная контр-рэволюцыя адносілася да прынцыпа адзінага класавага фронта, — аб гэтым Ігнатоўскі таксама лічыў непатрэбным расказваць.

У той-жа час Ігнатоўскі ў гэтай брашуры вельмі падрабязна апісвае партрэт каталіка Францішка Скарыны, які першым надрукаваў біблію на беларускай мове; ён расказвае таксама аб тым, што Скарына друкаваў кнігі для «простага народа»... Для гэтых апісанняў Ігнатоўскі знайшоў месца ў сваёй маленькай брашуры, але сказаць некалькі слоў аб ролі большэвіцкай партыі ў Кастрычніцкай рэволюцыі ў Беларусі ён лічыў лішнім.

Гэта яшчэ не ўсё. Ілжывы і нацыяналістычны падыход да асвятлення Кастрычніцкай рэволюцыі ў Беларусі, відаць таксама з яго ўказанняў, што адзіным недахопам беларускага кангрэса было тое, што ён «не меў комуністычнага кіраўніцтва». Толькі таму ён прызнаў рэзалюцыю, якая, з аднаго боку, прызнавала совецкую ўладу вышэйшым органам Беларусі, а, з другога боку, абвяшчала Беларусь дэмакратычнай рэспублікай і не прызнавала Совета Народных Камісараў Заходняй вобласці. Будзь знаёмы, комуністычнае кіраўніцтва, кангрэс-бы не прыняў такой рэзалюцыі. Але калі з гэтай мысліі Ігнатоўскага зрабіць лагічны вывад, трэба прызнаць, што роспуск большэвікамі кангрэса быў памылкай.

У снежні 1928 года «Полымя» надрукавала нацыяналістычны артыкул Жылуновіча пад назвай «Беларускія секцыі РКП», які з'яўляўся адказам на анкету «Кастрычніцкая рэволюцыя ў Беларусі». У гэтым артыкуле Жылуновіч ні адным словам не ўспомніў аб контр-рэволюцыйнай ролі беларускіх нацыяналістаў у часе Кастрычніцкай рэволюцыі. Ён таксама ні словам не ўспомніў аб нацыяналістычным дробна-буржуазным характэры Беларускай соцыялістычнай грамады і прабаваў даказаць, што заснавальнікамі Беларускай соцыялістычнай рэспублікі і

Аб правядзенні агляда-спаборніцтва на лепшую пастаноўку ўліка і справаздачнасці ў калгасах

Пастанова сакратарыята ЦК КП(б)Б

Лічачы вялікае гаспадарча-палітычнае значэнне правільнага ўліку ў калгасах і для непарушнага выканання, умацнення, разбазавання грамадскай маемасці і ўраджаю, своечасовага выкрыцця кулацкіх спроб падрываць аснову социялістычнага лада — грамадскую ўласнасць, ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Уключыцца ўсім партыйным, совецкім, прафесіянальным, комсамольскім і гаспадарчым арганізацыям у аглядспаборніцтва на лепшую пастаноўку ўліку і справаздачнасці ў калгасах, правядзімага зараз «Крестьянской газетой» і Наркамземам СССР пры ўдзеле сельгасадзела ЦК УсеКП(б), цэнтральнага кіраўніцтва народна-гаспадарчага ўліку і ЦКК УсеКП(б).

2. Лічыць асноўнымі задачамі агляда-спаборніцтва на лепшую пастаноўку ўліку і справаздачнасці ў калгасах наступныя моманты:

а) вывучэнне пастаноўкі сістэмы справаздачнасці, устаноўленай Наркамземам, з мэтай яе спрашчэння, палепшэння і арганізацыі яе так, каб яна была самай простай і неграмадзкай.

б) улік сабранай калгасамі прадукцыі, выкананне плана сельгаспаставак дзяржаве, расходавання прадуктаў і матэрыяльных каштоўнасцей у калгасах, як неабходная ўмова барацьбы за захаванне калгаснай уласнасці;

в) улік фінансавай дзейнасці калгаса і забеспячэнне ўліку вядзення фінансавай гаспадаркі калгаса;

г) улік працы калгаснікаў і своечасовае зачыненне ў працоўных кніжках выпрацаваных працадзён і правільнае налічэнне падлягаючага размеркаванню ўраджаю і даходаў у калгасах;

д) улік і падрыхтоўка да своечасовага складання гадавых справаздач за 1933 г.

3. Агляд-спаборніцтва правесці з 20 кастрычніка па 20 студзеня 1934 г. Прапанаваць НКЗБ даць указанні па гэтаму пытанню райземаддзелам і калгасам, а таксама стварыць прэміяльны фонд для калгасаў і рахункаводаў, лепш пастаўленых улік і справаздачнасць у калгасах.

4. Для правядзення агляда-спаборніцтва па БССР стварыць пры рэдакцыі «Звязды» пад старшынствам тав. **Брагінскага** камісію ў складзе прадстаўнікоў: ад апарата сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Жукаў**, ад ЦКК — тав. **Варонін**, НКЗБ — тав. **Залескі**, ЦК ЛКСМБ — т. **Камароў**, КНГУ — т. **Арцёмкаў**, ад Сацзембанка — тав. **Бушуеў**, камісіі па вызначэнні ўраджайнасці — тав. **Мікуноў**, рэдакцыі газеты «Калгаснік Беларусі» — тав. **Семянкоў** і сакра рабочых МТС і батрацтва — тав. **Керзенка**.

У раёнах непасрэднае кіраўніцтва і нагляд за ходам агляда-спаборніцтваажыццяўляецца раённымі камісіямі, арганізуемымі райкомамі пры раённых газетах пад старшынствам рэдактара газеты.

5. Абавязаць цэнтральныя і раённыя газеты сістэматычна асвятляць у друку як ход агляда-спаборніцтва, так і вынікі яго праз інфармацыйныя зводкі, агляды і наказ асобных калгасаў, прымаючых удзел у спаборніцтве.

Райкомам і гаркомам КП(б)Б, палітаддзелам МТС, фракцыям РВК і сельсоветаў устанавіць канкрэтнае кіраўніцтва і дапамогу калгасам у справе правядзення агляда-спаборніцтва па паладжанню ўліку і справаздачнасці ў калгасах.

Сакратар ЦК КП(б)Б
РЫСКІН.

АБ УЗМАЦНЕННІ БАРАЦЬБЫ ЗА ПРАВА ЎДЗЕЛА ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ І СЕЛЬСОВЕТАЎ БССР У СВЯТКАВАННІ XVI ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ Ў МЕНСКУ

Пастанова ЦК КП(б)Б

Адзначаючы абсалютна нездавальняючы ўдзел гаркомаў і райкомаў КП(б)Б, цэнтральных і раённых газет у разгортванні соцспаборніцтва паміж калгасамі і сельсоветамі на заваяванне—паспяховым выкананнем гаспадарча-палітычных кампаній—права ўдзела перадавых калгасаў і сельсоветаў БССР у святкаванні XVI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі ў Менску,—ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Прапанаваць гаркомам і райкомам КП(б)Б разгарнуць соцспаборніцтва паміж калгасамі і сельсоветамі на хутчэйшае і добраякаснае завяршэнне асенніх сельска-гаспадарчых работ, на датэрміновае выкананне сельгаспаставак дзяржаве і на заваяванне тым самым права дэлегавання перадавымі калгасамі і сельсоветамі сваіх лепшых ударнікаў на Кастрычніцкія святы ў сталіцу БССР. Рэдактарам цэнтральных і раённых газет забяспечыць у кожным нумары разгорнуты паказ соцспаборніцтва раёнаў, сельсоветаў, калгасаў, МТС і саўгасаў на права ўдзела ва ўрачыстасцях у кастрычніцкія дні ў Менску.

2. Прадаставіць гаркомам і райкомам КП(б)Б разам з палітаддзеламі МТС і саўгасаў права канчатковага падбора дэлегатаў на Кастрычніцкія святы ў Менск з лепшых энтузіястаў ударнікаў калгаснікаў, рабочых саўгасаў і МТС, брыгадзіраў і старшынь калгасаў, членаў і старшынь сельсоветаў, асабліва правяўшых сябе ў барацьбе за паспяховае і высокаякаснае правядзенне азімай сяўбы, капання і адгрузкі бульбы Ленінграду, збожжапаставак, натуроплаты МТС, ільназагатовак і ільнапрацоўкі, зяблевага ворыва, падрыхтоўкі да зімоўкі жывёлы і г. д.

Прадаставіць права цэнтральнай камісіі па соцспаборніцтву БССР з Заходняй вобласцю канчатковага прадастаўлення для раёнаў ліку дэлегатаў месц на кастрычніцкія святы ў Менску ў залежнасці ад паспяховага выканання імі важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній.

Прапанаваць рэдакцыям цэнтральных і раённых газет увесці з 18-га кастрычніка ў кожным нумары газет чырвоны спіс кандыдатур у лік дэлегатаў на кастрычніцкія ўрачыстасці ў Менску.

Масква, ЦК МОПР'а СССР—СТАСАВАЙ Елене Дзімітрыеўне

Сардэчна—горача вітаю вас, тав. Стасава, у дзень вашага шасцідзесяцігоддзя, як старэйшага большэвіка і палкага рэволюцыянера. З шасцідзесяці год больш паловы вы актыўна змагаецеся пад сцягам Леніна — Сталіна за справу рабочага класа. Такі слаўны шлях старэйшага большэвіка з'яўляецца дасканалым узорам для ўсіх працоўных.

Ваша імя, як большэвіцкага барацьбіта, вядома ўсяму рабочаму класу і ўсім працоўным Беларусі, бо ў змрочныя дні кераншчыны вы адыгрывалі выдатную ролю ў справе сувязі ўсіх большэвікоў Заходняга краю і Беларусі з Цэнтральным камітэтам нашай партыі. Згуртаванне гэтых большэвіцкіх кадраў вакол ЦК большэвікоў адыграла рашаючую ролю ў разгроме асэраўскіх і нацыяналістычных контр-рэволюцыйных сіл і забяспечыла арганізацыю працоўных мас, пад кіраўніцтвам нашай партыі, на перамогу Кастрычніка ў Беларусі.

Жадаю вам яшчэ шмат год працаваць на фронце будаўніцтва социялізма з такой-жа палкай энергіяй, з якой вы змагаліся да гэтага часу.

Старшыня СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД.

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГАСПАДАРЦЫ—ВЫСОКАЯКАСНЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

(На нарадзе пры „Звяздзе")

Гэтымі днямі пры рэдакцыі «Звязды» адбылася нарада кіруючых работнікаў і прафесарска-выкладчыцкага склада двух буйнейшых менскіх інстытутаў: інстытута народнай гаспадаркі і політэхнічнага інстытута. На нарадзе прысутнічалі таксама прадстаўнікі студэнцтва абодвух інстытутаў.

На нарадзе высветлілася, што побач са значнымі дасягненнямі па ўзбудаванню «жаркіхавых» ВНУ (політэхнічны інстытут арганізаваны на базе шасці інстытутаў), па пастаноўцы якасці ўсваення матэрыяла і ўліку паспяховасці студэнтаў, па пастаноўцы самога педагагічнага працэса, па ўзмацненню дысцыпліны — гэтыя інстытуты мацюць шмат хваравітых бакоў, зрываў.

Не дапускаць разрыва паміж рабфакам і ВНУ

З дакладаў і выступленняў удзельнікаў нарады перш за ўсё выявілася, што сёлета ў інстытуце народнай гаспадаркі мы мелі недабор студэнтаў. Яшчэ горшая справа з якасным складам прынятых студэнтаў. Так, на інстытуту народнай гаспадаркі сярод прынятых рабочыя складаюць 44 проц., калгаснікі — 13 проц. і дзеці спецыялістаў — 2 проц. Што ўяўляюць сабой астатнія цяжка сказаць.

У політэхнічным інстытуце сярод рабочых, прынятых сёлета, пераважная большасць з вытворчым стажам 2-3 гады.

Не дзіва, што ў выніку невыстарчаснай класавай пільнасці пры сёлетнім прыёме мы назбіралі ўжо зараз ворожыя вылазкі на групе нарасудзка.

У наяўнасці разрыў паміж рабфакам і ВНУ. Варта ўспомніць, што пры іспытах у політэхнічным інстытуце імя рабфакаўцы з Барысава і Менска паказалі надта нізкую акадэмічную падрыхтаванасць. Гэта сведчыць аб зусім недазвалёнаючай рабоце нашых рабфакаў. Між іншым, нават з вытрымаўшых іспыты 4-х рабфакаўцаў нельга было прыняць, выходзячы з іх сацыяльнага становішча.

Выкладчыцкі персанал—не на вышыні

Трэба сказаць, што забеспячэнне нашых інстытутаў прафесарска-выкладчыцкім персаналам яшчэ ні ў якім разе нельга лічыць адзначальнымі. У політэхнічным інстытуце з ліку 120 навуковых работнікаў толькі 17 прафесароў, дый з іх 7 чалавек не жывуць увесь час у Менску, а толькі прыязджаюць. У інстытуце народнай гаспадаркі з 105 навуковых працаўнікоў толькі 25 замацаваны за інстытутам, а астатнія працуюць па сумяшчэнню.

Звычайнай з'явай у політэхнічным інстытуце з'яўляецца прапуск лекцый выкладчыкамі сацыяльна-эканамічных дысцыплін. Яшчэ няма барацьбы за чысцтату марксіцка-ленінскага выкладання.

У інстытуце народнай гаспадаркі, напрыклад, аспірант **Курчэўскі** чытае курс эканомгеаграфіі. Гэты выкладчык (член партыі), калі гаворыць пра буржуазную Фінляндыю, то абмяжоўваецца толькі чыста геаграфічным апісаннем краіны, зусім абыходзіць пытанне аб Карэльскай АССР і цяперашнім сацыяльна-эканамічным і палітычным становішчы Фінляндыі.

— Армія Польшчы, — кажа другі выкладчык, таксама комуніст, — не можа быць моцнай таму, што яна інтэрнацыянальная. Іншая справа германская, аднанацыянальная армія (!). Адсюль напрошваецца вывад, што і Чырвоная армія ў сілу сваёй інтэрнацыянальнасці не можа быць моцнай.

Выступаўшы ў спрэчках праф. Манаў зусім правільна падкрэсліў, што вялікая колькасць навуковых работнікаў яшчэ не аўладала як належыць тэхнікай педагагічнага працэса. Тут вялікую ролю павінны былі-б адыграць кафедры, але ў сапраўднасці многія з іх бяздзейнічаюць, а іншыя займаюцца пустымі пасяжэннямі. Не арганізаваны мэтадычныя парады, намеснікі дыректароў па навучальнай частцы не ідуць далей складання расклада заняткаў. Да рочы, часопіс «Комуністычнае выхаванне» не адыгрывае ў гэтай справе адпаведнай ролі, яна зусім не ставіць бягучых набалелых пытанняў метадычнага парадка. Зусім не вядзецца ў самых інстытутах навукова-даследчая работа (калі не лічыць некаторых крокаў кафедры дакладных навук на чале з праф. Арлецка ў інстытуце народнай гаспадаркі ў галіне матэматыкі). Секцыі навуковых работнікаў не стала на чале ініцыятывы саміх выкладчыкаў, не стала такой арганізацыяй, якая-б накіроўвала творчыя шуканні прафесарска-выкладчыцкага персанала ў яго вытвар-часці. Па сутнасці яна зусім не працуе, а ЦП саюза працаветы не прымае ніякіх мер да аслыўлення работы секцый.

Пастановы кіруючых органаў павісі ў паветры

Пастанова СНК аб палепшэнні забеспячэння студэнтаў і навуковых работнікаў чамусці не знайшла сабе практычнага выяўлення ў політэхнічным інстытуце і інстытуце народнай гаспадаркі. **Студэнты не атрымліваюць снабжэння па нова-ўстаноўленых нормах, а цукру зусім не атрымліваюць.**

Каперацыйны факультэт у выніку абуранасці нядбайнасці Белкаапсаюза і спажыўбіяра «торгу» яго з Цэнтрасаюзам, абсалютна не забяспечан. З гэтай прычыны студэнты за лютень і верасень не атрымалі яшчэ стыпендый, а выкладчыкі лічаць сваю працу на факультэце «грамадскай нагрузкай», бо таксама цэлымі месяцамі не атрымліваюць зарплаты. 46 студэнтаў у выніку гэтага адсеяліся, з іх чатыры чалавекі з апошняга курса.

Справа з інтэрнатамі і харчаваннем надзвычай дрэнная. Новы корпус політэхнічнага інстытута на Камароўцы пакінен быў быць закончан да пачатку навучальнага года, але не закончан і па сёняшні дзень. І лістапада прыяжджаюць 27 груп інстытута з вытворчай практыкі, а для іх няма ні аднаго метра ні навучальнай, ні жылой плошчы. Пастановай СНК гэта будаўніцтва прыроўнена да звышударных і ўсё такі будаўнічыя арганізацыі злачынна зрываюць яго. Абсталяванне політэхнічнага інстытута валяецца па калідорах, пагвалах і пусецца. З 30 лабараторый абсталяваны толькі пяць.

Рабфак інстытута народнай гаспадаркі ў ліку 23 груп размешчан па 5 лазоках напаўпадвальнага памяшкання Дзяржплана, займаючыся там у 2 змены.

Сталоўка прапускной здольнасцю ў 600-700 абедаў ніяк не можа задаволіць зараз 1.820 студэнтаў і 1.200 рабфакаўцаў політэхнічнага інстытута. А трэба мець на ўвазе, што неўзабаве прыяжджае яшчэ значнае папаўненне з практыкі...

Прыгарадная гаспадарка няма. Для ўсіх навучальных устаноў Менска выначан 1 раён для дэцэнтралізаваных загатовак.

Эльвод сістэматычна пазбаўляе студэнтаў святла. Ім не прадастаўляецца ні ільготнага праезда на трамваі, ні ільготных білетаў у кіно і тэатры. Студэнты слаба забяспечаны лазняй і прань ня.

Мала чым лепшае і становішча маладых навуковых работнікаў, якія зусім не маюць сваёй сталоўкі, жывуць у надзвычай кепскіх квацэрных умовах і г. д. Усё гэта, зразумела, ні ў якай меры не спрыяе паспяховаму выкананню акадэмічнага, паспяховай барацьбе за новага совецкага спецыяліста.

Дзе-ж канкрэтная дапамога Наркамцяжпрама, Дзяржплана?

Рэалізм поспех змагання за выразны профіль будучага спецыяліста, за стварэнне яму ўмоў для вучобы зараз, вядома, немыслімы без канкрэтнай дапамогі тых устаноў і арганізацый, у ведамні якіх знаходзяцца тыя ці іншыя ВНУ.

У даным выпадку мы маем на ўвазе Наркамцяжпрам і Дзяржплан БССР.

Чым як не апартуністычнай нелаўнікай гэтай адказнейшай справы з боку сектара кадраў гэтых устаноў можна вытлумачыць абураючы спакой пры паўрозе зрыву ўсяго хода падрыхтоўкі спецыялістаў на цэлых пасобных факультэтах.

Цікава, што замест жывой, канкрэтнай дапамогі некаторыя наркаматы наваг перакладваюць рабоце сваіх ВНУ. Так, Наркамфін форменным чынам зрывае работу дыпламантаў, пасылаючы іх на раёны, загружаючы, наперакор раённым партыі і ўрада, шабочнай работай. Белкаапсаюз да гэтага часу не ведае, каго рыхтуюць ВНУ яго сістэмы і, мяняючы профіль студэнта, мяняе гэтым самым на 3-4 разы тэмы і змест яго дыпломных работ. 1-га лістапада канчаюць курс навучання 12 студэнтаў каперацыйнага факультэта, а факультэт зараз яшчэ не ведае, каго ён выпускае: тавараведаў ці тэхнолагаў. Яшчэ зараз дыпломныя тэмы не размеркаваны.

ЦБ пролетэтуда фактычна няма. Характэрная дробязь: на стале старшыні ЦБ тав. **Нехая** ўвесь час (!) ляжыць шперка: «Буду праз 15 хвілін. Пашоў у ОНК». Невядома, дзе сапраўды ходзіць т. Нехай, але ў ЦБ няма ні яго, ні работы.

ЦП прафсаюзаў са свайго боку не клапоціцца аб узняцці культурна-бытовага ўзроўня студэнтаў.

Штодзённа, па дзелавому кіраваць падрыхтоўкай кадраў

Было-б найпрасцейшна ўзвальваць усю віну за рад недахопаў і прарываў у абодвух інстытутах на вышэйстаячыя арганізацыі. Дырэкцыі, разам з усёй партыйнай арганізацыяй і політэхнічнага інстытута і інстытута народнай гаспадаркі маглі, безумоўна, напярэдадні раней многія недарэчнасці, якія выяўляюцца цяпер у ходзе навучання. Такія пытанні, як арганізацыя спецыяльнай прыгарадной гаспадаркі, як палепшэнне санітарнага становішча інтэрнатаў, як своечасовае набыццё падручнікаў (асабліва па сацыяльна-эканамічных дысцыплінах), як наладжанне работы кафедраў, разгрузка студэнтаў, — зразумела, трэба вырашаць сіламі самой дырэкцыі пры ўдзеле шырокай студэнцкай грамадскасці.

Але гэта ніколькі не знімае адказнасці за падрыхтоўку кадраў спецыялістаў у нашых ВНУ з тых устаноў, у ведамні якіх яны знаходзяцца.

Пагражаючае становішча з жыллёвай і навучальнай плошчай, асабліва ў політэхнічным інстытуце, патрабуе тэрміновага прыняцця адпаведных мер. Перш за ўсё трэба як мага хутчэй закончыць будаўніцтва новага корпуса політэхнічнага інстытута, а пакуль што прадаставіць інстытуту ў часовае карыстанне адзін з менскіх клубаў для размяшчэння аўдыторый і пакояў.

Кіраўніцтву інстытутаў, партыйным і прафсаюзным арганізацыям трэба ведаць адказнасці разгрузку студэнтаў адпаведна рашэнням ЦК. Секцыі навуковых работнікаў трэба замяніць пытаннем больш правільнай арганізацыі зарплаты навуковых работнікаў, палепшэнне іх матэрыяльна-бытавых умоў, замацаваннем за ВНУ патрэбнай колькасці прафесарска-выкладчыцкага персанала.

На аснове няўхільнага ажыццяўлення пастаноў партыі і ўрада трэба забяспечыць выпуск з гэтых інстытутаў высокакваліфікаваных спецыялістаў, узброеных марксіцка-ленінскай метадалогіяй і глыбокім веданнем сваёй справы.

Л. і П.

Пабудуем калгасны санаторый

У лісце да сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Гікало** калгаснікі калгаса імя Леніна, Пакалюбіцкага сельсавета (Гомельшчына) прапанавалі пабудаваць санаторый для калгаснікаў. Ініцыятыву калгаса імя Леніна першым падхапіў калгас «Кастрычніцкая рэволюцыя», Ратамскага сельсавета, Менскага раёна. Апульны сход калгаснікаў пастанавіў увесці на пабудову калгаснага санаторыя 1.000 руб., а кожны калгаснік уносіць у фонд пабудовы прадукты, належачыя яму за два працадні. Калгаснікі калгаса «Кастрычніцкая рэволюцыя» выклікалі на соцспаборніцтва калгас імя Варашылава, Ратамскага сельсавета, а таксама усе калгасы БССР.

Старшыня калгаса ШАЛУДКЕВІЧ.
Сакратар парт'ячэйкі КАСЦЮКЕВІЧ.

ПРЫВІТАННЕ ЦК ЛКСМБ

ЦК ЛКСМБ шле палкае прывітанне лепшым ударнікам-комсамольцам, чэкістам, фізкультурнікам—удзельнікам зорнай эстафеты імя 15-годдзя Усе.ЖКСМ.

Правядзеная эстафета ў гонар слаўнага юбілея—Ленінскага комсамола—пераварыравала ў справу ўсёй пролетарскай грамадскасці.

Сотні рапартаў ад лепшых заводаў і фабрык, перадавых калгасаў і саўгасаў з'яўляюцца лепшым камсамольцам шчырай адданасці рабочага класа і калгаснікаў нашай партыі.

Поспехі эстафеты павінны быць усямерна замацаваны ў справе далейшай перабудовы фізкультурнага руху і ператварэння фізкультурнай арганізацыі ў баявую масавую арганізацыю рабочага класа.

ЦК ЛКСМБ.

Усебеларускі конкурс ССТ і міжрайбаз

ЛЕПЕЛЬСКАЯ БАЗА—АРГАНІЗАТАР КУЛЬТУРНАГА СОВЕЦКАГА ГАНДЛЯ

«...Адзначыць, што Лепельская база БКС нерабудавала сваю работу ў напрамку непасрэднай сувязі з ССТ, узмацніла гандаль недэфіцытнымі таварамі, дабілася выканання плана тавараазвароту па вёсцы і зніжэння выдаткаў аварота, увязаўшы водпуск тавараў вёсцы з ходам уборачна-загатоўчай кампаніі».

Так яшчэ ў канцы мінулага ахарактарызаваў работу Лепельскай базы СНК БССР.

Са дня апублікавання пастановы СНК аб тавараазвароце прайшло больш месяца. За гэты час база не знікла тэмпаў работы, паказала сябе сапраўдным арганізатарам совецкага гандля і выйшла на першае месца ў БССР па разгортванні тавараазвароту. **База з'яўляецца кандыдатам на прэмію ва ўсесаюзным конкурсе міжрайбаз.**

Павялічаны план тавараазвароту 3-та квартала ў суме каля 3 млн. руб. (супроць плана другога квартала ў 2 млн. 400 тыс.) Лепельская база выканала на **102,8 проц.**

Радам прыкладаў пакажам, якімі шляхамі заваяваны гэтыя поспехі. На ўзорах работы базы трэба вучыцца, бо яна поўнасцю выкрывае ўсю кулацкую тэорыю ўзрастання вёскі. У **Каменскім** і **Сушанскім** сельсветах праведзены спецыяльныя сходы калгасных брыгад, узяты канкрэтныя заяўкі на тавары. Што-ж аказалася? Многія каперацыйныя работнікі не чакалі такіх выпадкаў. Калгаснікі патрабавалі завозу такіх тавараў, якімі база раней не гандлявала, лічачы іх ніходкімі. Гэта — жалезныя ложкі, музычныя інструменты, дзіцячыя цацкі, швейныя машыны, веласіпеды, канапы, радыёпрыёмнікі, коўдры, гадзіннікі і інш. 200 назваў розных тавараў знаходзім мы ў гэтых заяўках. Яны аллюстроўваюць велізарны рост дабрабыта калгаснага сялянства, заваёўваючага заможнае жыццё. ОСТ перадаў ужо базе аводны заказ на суму 300 тыс. руб. Ён амаль у два разы перавышае квартальны план тавараазвароту Каменскага сельспажыўтаварыства.

Рад прамыслова-гандлёвых арганізацый заснавалі раней базу бракаванай прадукцыяй. База палала рашучую барацьбу за якасць тавараў. Напрыклад, калгаснікі скардзіліся на дрэнную якасць абутка з «кажэмітавай» сцілкай. База забрала назад гэты абутак і спагнала ад пастаўшчыкоў 40 тыс. руб. штрафа. Яна кантралюе рублём работу прамысловасці. База добра зразумела, што **барацьба з бракам—адна з важнейшых умоў разгортвання тавараазвароту.**

Некалькі прыкладаў таго, як Лепельская база дапамагала рабоце райсаюзаў і сельспажыўтаварыстваў. На-першае, яна дабілася ад банка крэдытавання лепшых сельспажыўтаварыстваў, каб даць ім магчымасць своечасова вы купляць тавары. Як вядома, банк звычайна крэдытаваў толькі базы і райсаюзы.

Былі выпадкі, калі сельспажыўтаварыствы не маглі з-за адсутнасці грошай забраць тавар. База не падышла да іх фармальна, не спыніла продажу тавараў; яна імкнулася дакладна выявіць, чаму даны райсаюз або ССТ не мае сродкаў, чым можна ім дапамагчы і наленшыць фінансавае становішча.

Вось ССТ **Ушацкага** раёна на працягу другога квартала недавыбралі 40 проц. тавараў і зрывалі выкананне свайго плана. База выявіла, у чым тут справа. Аказваецца, ССТ ўкладі свае зваротныя сродкі ў загатоўкі, а райсаюз на працягу доўгага часу не вылічваў ім грошай. Запазычанасць перавышае 80.000 руб. База паставіла пытанне аб поўным разліку райсаюза з пізоўкай і дабілася, што ў трэцім квартале ССТ выйшлі з прарыва, забралі ўсе вызначаныя ім тавары і разгрузілі гандаль недэфіцытнымі таварамі.

Чашніцкі райсаюз, які ўвесь час добра аплачваў рахункі базы, раптам апынуўся без сродкаў. Прадстаўнікі базы неадкладна выехаў на месца і выявіў, што ў раён завезена вялікая колькасць вінных вырабаў, якія можна рэалізаваць толькі праз месяц-два. База забрала гэты тавар на свой склад і прадала яго ў іншым раёне. Яна дабілася кароткатэрміновага крэдыта для райсаюза ў суме 50.000 руб. і ажыццявіла такую-ж суму са сваіх прадуктых лімітаў. У выніку на рабіе адпоўлае нармальны тавараазварот.

Адной з важнейшых умоў поспеха з'явілася **добрае абслугоўванне слуцкі, ўборкі і пастаўак.** Лепшы асартымент і большая колькасць тавараў перажынуты ў перадавыя сельсоветы і вёскі для стымулявання ўдарнай работы. Завоз у адсталыя сельсоветы быў скарочан.

Вось прыклады. Свяцкі сельсавет, Лепельскага раёна, паспяхова скончыў уборку і абожжапастаўкі. База прэміявала сельсавет прамтаварамі. Перадавы калгас «Новае жыццё» атрымаў вакоўнае шкло, махорку, шпільки, кажухі, піджакі, галошы, хусткі, цукар для дзіцячых ясляй.

Калгас «Новы будаўнік» выйшаў на першае месца па Лепельскім сельсавеце. Яму адпружана шыкнае жалеза, вакоўнае шкло, махорка, вопратка і інш.

Прэміяваны прамтаварамі два ўшаўнаважаныя дасенцыёрак Латнталіцкага сельсавета—Хрушкі і Кажамякін.

Калгас «Чырвоны бор», «Чырвоная Бяседа», «Чырвоны ўсход» і інш., якія да тэрміна адгрузілі бульбу, атрымалі звыш плана для прэміявання лепшых ударнікаў мануфактуру, мыла і розныя гаспадарчыя рэчы.

У часе восенняй і асенняй сяўбы база завезла у зверхплановым парадку 6 вагонаў цыгляга жалеза і 2 вагоны лемяхоў і адвалаў.

База сваёй работай даказала, што можна ў некалькі разоў павялічыць тавараазварот пры ўмове вывучэння і арганізацыі попыта калгаснікаў і падпарадкавання гандлёвай работы задачам узлыма калгаснай вытворчасці.

Ч. і Б.

П. Шастакоў

Адступае балота

На лысым пясчаным узгорку вецер гуляў з чыстым і сыпкім пясочкам. Тонкая пясчаная мяцель сям-там узнімалася і паўзла па вяроўнай паверхні, блісканочы на сонцы, шукаючы на чым-б затрымацца, дзе-б насыпаць сухі, сыпкі сумёт.

А наўкол шумела Суцінскае балота. Каравыя бярозкі, кацыя недамеркі-сосенкі, альховы хмызняк і калматая лаза гойдаліся над напорам ветра, нахіляліся кудысьці ўпарад, нібы хацелі вырвацца з непраглядной балоты і бегчы праз балотны куп'ёшнік разам з ветрам у блямкнную даль, дзе няма балота.

Шумела Суцінскае балота. Дзесяткі тысяч гектараў балоты, моха, куп'я сумавалі ў слязах журавін пад ціхі шолах ветра і галодны вой жаўкоў...

А вясною праз балота ішла вада з Пцічы ў Снёслач. І тады балота здавалася прозным морам, зусім непрыступным.

Раскаваюць так. Неяк адным гарачым летам перад імперыялістычнай вайной прышоў на пясчаную лысіну чалавек з тупа набітымі кішэнямі. Доўга стаяў ён, назіраў на балота і нешта думаў.

Трасануў ён кішэнямі і пайшоў да суцінскіх узгоркаў балот і павёў з імі гутарку:

— Мужыкі, я вам асушу балота, а вы мне потым будзеце плаціць з кожнай дзесяціны...

Дагаварыліся. Закіпела работа. У выніку — доўгая канава з дзесятак кілометраў лягла праз балота да рэчкі Пцічы.

Нібы ў карыце стала ў канаве вада. Ні з Пцічы, ні ў Пціч. Багна засталася багнай. Аматар лёгкай нажывы пайшоў шукаць іншых крыніц, шукаць «скарбаў», якія не так глыбока закопаны...

Так апавядаюць тубылцы Суціна, Мацієвіч, Жыціна і іншых вёсак, блізкіх да суцінскага балотнага масіва.

А вось, што кажуць пра больш позні час.

Увесь аддаецца успамінам стары Жыш, першы загадчык гаспадаркі ў саўтасе «Залог пяцігодкі».

За спіной Жыша доўгая вераніца цяжкіх гадоў — імперыялістычная, грамадзянская вайна, барацьба з бандытызмам, «мірная» работа ў зямельных органах, у каапераціі. Ёсць пра што расказаць Жышу, чалавеку пад 60 год, пар тыйцу з 1918 года. Аднак, ні пра што так цёпла і цікава не аладвядае стары Жыш, як пра першыя дні, месяцы, пра першыя два гады жыцця і барацьбы саўгаса, які сеў на пясчаным узгорку, абкружаны бязмежным Суценскім балотам.

— Не так страшна было балота, звяр'ё, бандыты, як цяжкі быў здзекі жакоў нада мною, над маёй хаткай, над усёй нашай заценй. Абходзіш вёску, купляеш жароў, а цябе злосным смяшкам даймаюць.

— Што селі большыкі ў балота? А яно гроны любіць... Тут нейкі аднойчы лаўсач аб'явіўся, наабяцаў цэлы коробаў, а потым ўзяў гроны ў канаву і збег... Справа дацяняя, а прызнацца — мала было веры ў добрыя вынікі пачатай работы. Непрыемна, цяжка было спускацца з узгорка да ўсяраіны балота, каб лішні раз пераканацца, што на балотнаму куп'ёшніку не прайсці, не праехаць, што ўсё засталося на сваім месцы, што і канава, пракапаная да Пцічы яшчэ да вайны, нічога не зрабіла балоту.

Так гаворыць тубылец саўгаса «Залог пяцігодкі» стары Жыш. Расказы сівога, слухаватага пасля тыфа першага загадчыка гаспадаркі саўгаса тав. Жыша — гэта жывыя ўспаміны першых дзён падрыхтоўкі да штурма балота, да ўпартай барацьбы з вадою, куп'ём, зарасцямі, з непрыступнасцю балота. Цікавы ўспаміны Жыша. З іх можна скласці карысную, патрэбную кніжку. Аднак, не менш цікава сучасная сапраўднасць, вядае фаўне балота. Шпарка ходзіць тав. Звяровіч. Ледзь затрымаецца, то глядзі і не дагоніш, а то і проста дзенебудзь згубіш на балоце. І не дзіва. Сланечнікі нахілілі цяжкія яркі жоўтыя галовы. Аднак і з нахіленымі галовамі лес сланечнікаў вышэй узнятай галавы тав. Звяровіча. А рост Звяровіча — два метры, а мо' і больш. Авёс узнімуся ва ўзровень з чалавекам. Віка не хоча адстаць ад аўса...

Цікава расказвае тав. Звяровіч.

— Цяжка тут, але не хачу нікуды адсюль. Перспектывы вабяць. Не балота тут, а залатое дно...

Пра нядаўняе мінулае саўгаса расказвае тав. Звяровіч.

— Атрымаў саўгас у 1932 годзе першыя трактары. Сумненне многіх брала.

— Як-жа пойдзе па балоту трактар? — злараднасна смяяліся суцінскія кулакі.

— Як пойдзе па балоту трактар? — мармыталі пад рынненне першай трэстаўскія чынушы.

— Як-жа пойдзе па беларускім балоце трактар? — спусаўшы пацдэмаўскі нос, асядлаўшы рагавымі акулярамі...

— Трахт-а-аррр! — перамяшаліся кулацкія галасы злобы і адзяўлення з тарканнем суцінскіх сабак, калі машыны падыходзілі да саўгаса.

— А шчэ было ўвосень, — вядзе далей свой расказ тав. Звяровіч.

Падрыхтавалі мы на балоце 50 га пад жыта. Трэба сеяць, а ўпасення няма. І я рашыў — буду сеяць на балоце без упасення...

І трактары пайшлі на балоце. Жыта 50 гектараў было засеяна. Спачатку было туга.

Пашырыцелі, якія мы прыстасавалі да трактарных колаў, выратавалі становішча. Цяпер вось бачыце...

Усцяж канавы выцягнулася цёмнакарычневае ворыва. Свежы амаль у метр шырынёю ды ў паўметра таўшчынёю ляжыць на балоце доўгія тлустыя скрыні. Рэшткі старых лясных багаццяў — карчы, бярозта — выйшлі з тысячагадовага змрока на свет і ляжыі на кавальеру.

— Дарэмныя былі страхі, — смяецца тав. Звяровіч, — аднак, калі-б не трактар, прышлося-б цягнуць разам з вёўкамі вёўчыныя песні. А цяпер у нас дзесяць «Інтэрнацыяналаў»...

Сёмка засцепліва і радасна ўсміхаецца дырэктару. Потым глядзіць на трактар і спакойвалку.

— Вось не могуць даць рады машыне, тав. дырэктар.

На твары дзіўчыны набягае цень. І постаць яе, напітаная гарачай крывёю і сонцам, робіцца хаолай на фоне высокага як лес жыта. А серп у руках зда цяпер маленькім як цацка.

„Ростсельмаш" пасварыўся з ураджаем

Трывожны настрой Сімы перадаецца і дырэктару саўгаса. Планы ўборкі разлічаны на бесперабойную работу двух снопавязалак, а тут — стоп, не хоча работаць «Ростсельмаш» на беларускім балоце.

Запэцканы нагарам і маслам, абліваючыся потам разводзіць рукамі перад машынай механік Балевіч. Хмура пазірае са свайго высокага сядзення трактарыст Лінчык, Машынист Окавыш возіцца з нізкім элеватарам машыны і прабуе шпагат. Тав. Звяровіч абгледзіў верхні элеватар, падцягнуў дзяліцель і сеў на машыну.

— Ну!..

Бесперашкодна застукаў трактар і рушыўся па кавальеру. Застрэкатала сно павязалка. Закруцілася матавіла. Пайшло жыта на элеватару. Выскачыў вялікі, плятрабны снап.

— Стоп! — нервова крыкнуў тав. Звяровіч.

Машына падавілася другім снопам? Зноў заваяліся людзі. Зноў пайшла машына. Але-ж як пайшла? Там, дзе цяжкія каласы нахіліліся ўніз, а машыны сталі выскакваць снапы амаль што без каласоў. А каласы ўсеялі зямлю...

— Не, так-яка нельга. Гэта шкодніцтва, калі столькі будзе страт. Прыдзецца ўручную, сярпамі ды касамі. Ніякі элеватар не ўмяшчае нашага жыта...

Дырэктар саўгаса узнервованы. Ён любіць машыну і добра яе ведае, а тут трапіў у такое непрыемнае становішча.

Так і не асвоілі сёння машыны, снопавязалкі «Ростсельмаш». Як хочаш, так і разважай. А балота аказалася вінавата толькі ў тым, што дало такі ўраджай жыта.

... На другі дзень раніцой спачэ да ўсходу сонца, калі шум сасонніка на такой-яка клапатунная сёння гэты авёс.

Сёма засцепліва і радасна ўсміхаецца дырэктару. Потым глядзіць на трактар і спакойвалку.

— Вось не могуць даць рады машыне, тав. дырэктар.

На твары дзіўчыны набягае цень. І постаць яе, напітаная гарачай крывёю і сонцам, робіцца хаолай на фоне высокага як лес жыта. А серп у руках зда

ГІТЛЕР МАНЕЎРУЕ

ПРАГА, 16. (БЕЛТА).

Згодна паведамленню з Берліна, Гітлер выступіў 14-га кастрычніка па радыё з прамовай.

«У лістападзе 1918 г., — сказаў Гітлер, — германскі народ, паверыўшы запэўненням Вільсона, склаў зброю»...

«Калі ўсе гэтыя ахвяры не прывялі да сапраўднага ўмяцнавання народаў, дык гэтаму быў віной толькі дагавор, які рабіў розніцу паміж пераможанымі і пераможанымі і тым самым павінен быў увекавечыць ненавісць».

«Нацыянал-сацыялістскі рух хацеў толькі засцерагчы Германію ад катастрофы і ад комунізма і тым самым мае перад усёй Эўропай вялікія заслугі».

«У Германіі, — гаварыў далей Гітлер, — ёсць толькі адзін носьбіт улады — армія, у якой толькі адна задача — барацьба з комунізмам».

Пераходзячы далей да апошняй прамовы Далад'е, Гітлер заявіў:

«У нацыянал-соцыялістскай Германіі адзінае жаданне — накіраваць суверэнітэта эўрапейскіх народаў у тыя галіны, у якіх усё чалавецтва дабілася-б у добрасумленным спаборніцтве небывалых поспехаў для цывілізацыі, культуры і мастацтва».

«Увесь германскі народ горача жадае назаўсёды знішчыць варожасць паміж абодвума краінамі». Германія не мае ніякіх тэрытарыяльных канфліктаў з Францыяй, — гаварыў далей Гітлер, — калі-б Саарскую вобласць вярнулі Германіі, дык знік-бы ўсякі повад для выпраўлення межаў. Калі Францыя запытаецца, чаму Германія патрабуе ўзбраенняў, якія ўсёроўна пасней будуць знішчаны, то трэба адказаць, што германскі ўрад патрабуе не ўзбраенняў, а роўнапраўя. Калі свет паставіць знішчыць усе ўзбраенні, то Германія неадкладна далучыцца да такой канвенцыі.

Германія мае такое-ж права на бяспечнасць, як і іншыя нацыі».

«У бяспечнасці Германіі нельга ўгледзіваць ніякай пагрозы іншым народам. Германія хоча мець толькі тую або розную зброю, якая дазваляецца і іншым народам. Германія хоча задаволіцца мінімумам, які не павінен знаходзіцца ні ў якіх адносінах да ўзбраенняў іншых народаў. Але Германія не можа прымаць удзела ў дагаворах або супрацоўнічаць у арганізацыях, у якіх працавалі магчыма толькі тым, хто страціў свой гонар».

***

ПРАГА, 16. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Берліна, міністр прапаганды Гебельс пры адкрыцці помніка каля Гонефа (Рэйнская вобласць) заявіў:

«Мы гатовы паставіць крыж на мінулым, але хочам, каб і іншыя краіны правялі гэту гатоўнасць, бо Эўропа мае іншыя задачы і не ставіць сваёй мэтай увекавечыць варожасць. Народы маюць права патрабаваць, каб іх урады, нарэшце, прыступілі да ўрэгулявання вялікіх праблем вайны і пасляваеннага перыяда. Мы не можам траціць часу. Калі народы пераканаюцца, што іх урады не гатовы і нездольны ўрэгуляваць гэтыя праблемы, дык яны могуць звярнуцца да большэвізма. Мы пакідаем міжнародныя канферэнцыі таму, што там з намі прымалі сябе як з другарадным дзяржавай, але мы гатовы абмяркоўваць праблемы з любой краінай, у тым ліку і з нашымі былымі праціўнікамі. Аднак, умовай усякіх перагавораў павінна быць прызнанне роўнапраўя Германіі».

ВОДГУКІ ВА ФРАНЦЫІ НА ВЫСТУПЛЕННЕ ГІТЛЕРА

ЖЭНЕВА, 15. (БЕЛТА).

Прамова Гітлера ў той частцы, у якой ён прабуе скарыстаць «напрозу комунізма» ў якасці фрозе для завяршэння з Францыяй, сустракае ва французскіх колах несхрываемыя нагардлівыя адносіны. Нескалькі даволі аўтарытэтных асоб заявілі, што заходнія дзяржавы маюць даволі сіл, каб справіцца з любымі небяспекамі і што для гэтага яны не маюць патрэбы ў дапамозе Гітлера.

Бонкур зрабіў з гэтага повада представіўнікам французскага друку заяву, у якой падкрэслівае, што выступленне Гітлера — вязрабны манеўр.

Як перадаюць, Гітлер нядаўна праз французскага посла ў Берліне Пансе прапанаваў Далад'е сустрэцца з ім, але Далад'е адказаў адмаўленнем.

ВОДГУКІ У ЛІЗЕ НАЦЫЙ

ЖЭНЕВА, 16. (БЕЛТА).

Паведамленне аб выхадзе Германіі з Лігі нацый і з канферэнцыі па разбраенні выклікала вялікае ўзбуджэнне ў колах Лігі нацый і канферэнцыі. Гэты крок Германіі з'явіўся вялікай нечаканасцю не толькі для італьянскай, але нават і для германскай делегацыі.

Паводле весак, рашэнне аб выхадзе з Лігі нацый было канчаткова прынята ў Берліне пасля атрымання паведамлення аб тым, што на пасяджэнні бюро стварыўся адзіны фронт супроць Германіі.

Сёння раніцай Гендэрсон раіўся з делегатамі Францыі, ПАЗШ, Англіі і Італіі, а таксама Бенешам і з Поліціясам аб далейшым ходзе работ. Абмяркоўваўся галоўным чынам праект адказа фон Нейрата ад імя канферэнцыі па разбраенні.

Тут лічаць не выключаным, што Мусаліні можа выступіць зараз з прапановай аб скліканні канферэнцыі чатырох дзяржаў.

Аднак, ва французскіх колах заяўляюць, што з выхадам Германіі з Лігі нацый «акт чатырох» перастае існаваць і што на ўсякім выпадку Францыя не ратыфікуе яго. Адначасова з гэтым падкрэсліваюць, што Германія пасля выхада з канферэнцыі па разбраенні зноў надпадае пад рэжым, прадугледжаны пятай часткай версальскага дагавора (аб ваенным статуце Германіі).

У сувязі з гэтым напамінаюць таксама аб артыкулах 164,154, і 213, а таксама аб рэзалюцыі ад 11 снежня 1926 г. совета Лігі нацый, на падставе якіх совет Лігі нацый можа ў любы час зрабіць абследаванне ўзбраенняў Германіі.

Згодна вестямі напярэдадні тут думкі, рашэнне Германіі аб выхадзе з Лігі нацый часткова з'яўляецца дыверсіяй з мэтай адцягнуць увагу ад цяжкога эканамічнага становішча ўнутры краіны і ад зрывіса ўнутры нацыянал-сацыялістскай партыі.

Каментарыі румынскага друку

ВЕНА, 16. (БЕЛТА).

У сувязі з выхадам Германіі з Лігі нацый румынскі друк усхладае на Германію адказнасць за правал канферэнцыі па разбраенні і чакае ўмацнення сведамасці тых дзяржаў, якія «ахоўваюць непарушнасць міжнародных дагавораў». Югаслаўскі друк, а таксама друк Балгарыі процідастаўляюць палітыцы Германіі балканскую палітыку ўзаемнага збліжэння.

Адзіны фронт Крупп—Гітлер

ПРАГА, 16. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Берліна, старшыня саюза германскай прамысловасці Крупп пасла Гітлеру і Гінденбургу пры вітальным тэлеграмы з прычыны выхада Германіі з Лігі нацый і адмаўлення германскай делегацыі па разбраенні. Крупп падкрэслівае, што гэта рашэнне «дае германскай прамысловасці магчымасць аказаць сваю непарушную верасць».

БЮРО ЖЭНЕЎСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ АБ ВЫХАДЗЕ ГЕРМАНІІ З ЛІГІ НАЦЫЙ

ЖЭНЕВА, (БЕЛТА).

Бюро канферэнцыі па разбраенні на кароткім закрытым пасяджэнні пастанавіла прапанаваць генеральнай камісіі адтэрміноваць работы бюро да 25 кастрычніка і генеральнай камісіі да 26 кастрычніка. Гендэрсон паведаміў, што на разгляд генеральнай камісіі ўпесся наступны тэкст свайго адказа Нейрату:

«Я перадаў генеральнай камісіі вашу тэлеграму ад 14 кастрычніка, у якой заяўляецца аб рашэнні германскага ўрада спыніць удзел у работах канферэнцыі і прыкладаюцца прычыны гэтага рашэння. Германскі ўрад зрабіў гэты крок якраз у момант, калі бюро прыняло рашэнне прадставіць генеральнай камісіі поўную праграму разбраення, якая павінна была быць канчаткова распрацавана ў абмежаваны перыяд. Гэта праграма прадугледжвала ажыццяўленне разбраення этапамі ў адпаведнасці з рэзалюцыямі канферэнцыі, за якія Германія сама галасавала, выказваючыся тым самым за формы скарачэння ўзбраенняў падобныя тым, якія прадугледжаны праектам канвенцыі, прадстаўленым генеральнай камісіі. Тая-ж праграма прадугледжвала далей пры адпаведных гарантыях бяспечнасці ажыццяўленне роўнапраўя ва ўзбраеннях, што германскі ўрад заўсёды высоўваў на першы план сваіх патрабаванняў. Вось чаму я шкадую, што сур'ёзнае рашэнне было прынята германскім урадам з меркаваннямі, якія я не магу прызнаць упрытаванымі».

Пасля пасяджэння бюро была скліканая генеральная камісія канферэнцыі па разбраенні.

ЗАЯВА ЯПОНІІ

ТОКІО, 16. (БЕЛТА).

Заяўляючы замежным карэспандэнтам што выхад Германіі з Лігі нацый не адаб'ецца на замежнай палітыцы Японіі, прадстаўнік міністэрства замежных спраў абвергнуў паведамленні эўрапейскага друку, што Германія напярэдадні выхада з Лігі нацый «у той ці іншай ступені раілася з Японіяй».

„БЕССЭНСОЎНЫ ФАРС"

ЛОНДАН, 16. (БЕЛТА).

Берлінскі карэспандэнт «Обсэрвер» называе назначэнне выбараў у рэйхстаг «бессэнсоўным фарсам». Паводле слоў газеты, выбары маюць на мэце адцягнуць увагу ад праваленага Лейпцыгскага працэса.

ПРАЦЭС АБ ПАДПАЛЕ РЭЙХСТАГА

Пратэст міжнароднай следчай камісіі

ПАРЫЖ, 16. (БЕЛТА).

Міжнародная следчая камісія па справе аб падпале рэйхстага паслала старшыні суда ў Берліне 2 тэлеграмы. У адной з іх камісія пратэстуе супроць апублікавання 12-га кастрычніка ў «Ангрыф» артыкула з выпадамі супроць замежных адвакатаў, якія прысутнічалі на працэсе.

Камісія кваліфікуе гэты артыкул, як «падбухторванне да забойства пяці замежных адвакатаў».

Другая тэлеграма змяшчае пратэст супроць высылкі замежных адвакатаў Грыгорава, Дзечава, Галахера і Віллар да з Берліна.

«Гэта высылка даказвае—падкрэсліваецца у тэлеграме—што прысутнасць бесстаронніх замежных адвакатаў у сучасны момант непажадана і што падсудных балгар хочуць пазбавіць апошняй магчымасці абароны».

Камісія склікае спецыяльнае публічнае пасяджэнне для абмеркавання апошніх падзей, меўшых месца па працэсе.

ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫ ЗЛОДЗЕЙ— У РОЛІ „СВЕДКІ"

ПРАГА, 16. (БЕЛТА).

З Берліна паведамляюць, што адным з галоўных сведак «абвінавачання», як вядома выступіў на працэсе аб падпале рэйхстага Гротэ, які паказаў, што Ван-дэр-Любе падтрымліваў сувязь з ЦК германскай компартыі.

Гэты Гротэ, як аказваецца ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫ ЗЛОДЗЕЙ, які не раз судзіўся за крадзеж. У пачатку гэтага года ён прымаў удзел у крадзяжы з узломам у адным кніжным магазіне, дзе было ўкрадзена кніг на 10 тыс. марак. Некалькі месяцаў назад Гротэ прапанаваў продаж некалькі сот крадзеных кніг, у сувязі з чым на яго была падана скарга ў суд.

Уступленне ў сілу лонданскай канвенцыі паміж СССР, Польшчай і Румыніяй

МАСКВА, 16. (БЕЛТА).

16 кастрычніка ў народным камісарыяце па замежных справах надзвычайным паслам'ям і паўнамоцным міністрам Польскай рэспублікі п. Юліусам Лукасевічам дакладвана ратыфікацыйная грамата Лонданскай канвенцыі аб азначэнні агрэсіі ад 3-га ліпеня 1933 года, падпісаная п. прэзідэнтам Польскай рэспублікі. У той-жа дзень у народны камісарыят па замежных справах паступіла па захаванне ратыфікацыйная грамата той-жа канвенцыі, падпісаная каралём Румыніі.

З прычыны гэтага і з прычыны падпісання ратыфікацыйнай граматы той-жа канвенцыі старшынёй ЦВК Саюза ССР, лонданская канвенцыя ад 3-га ліпеня г. г., згодна артыкула 4 указанага акта, з 10 кастрычніка ўступіла ў сілу паміж Саюзам ССР, Польскай рэспублікай і Румыніяй.

Аб вышэйказаным складзены належныя акты за подпісам народнага камісара па замежных справах тав. М. М. Літвінава і паведамлены іншыя ўдзельніцкі канвенцыі.

„СІБІРАКОЎ" У АРХАНГЕЛЬСКУ

МАСКВА, 17. (БЕЛТА).

16 кастрычніка ў 14 гадзін ледакол «Сібіракоў» прыбыў у Архангельск. Цяжкі палярны рэйс удала закончан.

Услед за «Русанавым» 15 кастрычніка ў 18 гадзін на Архангельскім рэйдзе кінуў якар ледакол «Таймыр».

Самы кароткі 20-дзённы рэйс пасяхова закончан. Ледакол дастаўляў апошнюю ў гэтым годзе партыю зімоўшчыкаў, абсталяванне і прадукты ў бухту Цікую (Зямля Францыі Іосіфа). 14 кастрычніка ў Мурманскі порт прышоў ледакол «Красін».

— Яшчэ не ўсе квадраты вярнуліся з палярных рэйсаў, — заявіў у гутарцы з супрацоўнікам РОСТА дырэктар Усесаюзнага арктычнага інстытута прафесар Р. Самойловіч, — але ўжо можна падсумаваць папярэднія вынікі работы экспедыцыі ў гэтым годзе.

Велізарную ролю ў пасяховай правядзе судна адыграў ледакол «Красін». Ён аблягчыў «Чэлюскіну» праход праз Карскае мора, дастаўляў караван суднаў у вусце Лены і сумесна з «Русанавым» вызваліў «Сібіракова» ад палрозы немінучай зімоўкі.

На аснове атрыманых навуковых даных, пачата ўжо распрацоўка плана работ у совецкай арктыцы ў 1934 годзе.

Шкоднікі Аршанскай страхкасы

Прыехаўшы ў Оршу, намеснік загадчыка культаддзела ЦОПСВ тав. Рубінштэйн выявіў арганізаваны сабатаж у справе зліцця органаў сацстраха з праф саюзамі з боку групы работнікаў страхкасы на чале са старшынёй Царэня. Работнікі страхкасы Макоўская, Франкова, Чэркасаў, Калініна шляхам падлогаў сістэматычна раскрадвалі дзяржаўныя сродкі, разбазаравалі прадукты, наладжвалі папойкі ў кватэрах супрацоўнікаў страхкасы. Апошняя папойка адбылася ў доме адпачынку, дзе праверкай выяўлена раскрадванне прадуктаў, прыблізна, на 8.000 руб. па цвёрдых цэнах.

Наўмысна заблытаўшы ўлік інвалідаў, група гэта стварыла такую сістэму іх абслугоўвання, пры якой любы пенсіянер мог карыстацца двума або трыма карткамі. Акты аб памёршым або выехаўшым інваліде не складаліся, пенсія паступала ў рукі загадчыцы пенсійным сталом Макоўскай і яе прыяцеляў, з якімі яна наладжвала папойкі. Калі інвалід атрымліваў 10-15 руб., то работнікі страхкасы шляхам дабаўлення нуля атрымлівалі 100-150 руб.

Растратчыкі наўмысна так заблыталі справы, асабліва ўлік інвалідаў, што цяжка нават устанавіць усю суму растрадзеных сродкаў.

Старшыня страхкасы — «комуніст» Царэня, прымаўшы ўдзел у п'янстве, арося з чужымі, шкодніцкімі элементамі, пакрываў злоўжыванні, зрываў складанне каштарысаў і планаў, затрымліваў адпраўку вестак ЦОПСВ, адначасова высуноўўшы «тэорыю» аб немагчымасці ў кароткі тэрмін скончыць зліццё. Гэта было праблема з мэтай яшчэ большага заблытвання спраў і далейшых злоўжываванняў.

Зараз шкоднікі арыштаваны ЦОПСВ накіраваў у Оршу спецыяльную камісію. На бліжэйшым пасяджэнні прэзідыума ЦОПСВ будзе абмеркавана пытанне аб далейшай рабоце аршанскага райпрафсовета, які выпусціў страхкасу з пад сваёго кантроля.

Справа, выкрытая ў Оршы, патрабуе ўзмацнення пільнасці з боку ўсіх партыйных і прафсаюзных арганізацый БССР. Класава-чужыя элементы, якія прабраліся ў некаторыя страхкасы, тармозяць выкананне дырэктыў урада аб зліцці органаў працы і сацстраха з прафсаюзамі. Аб гэтым сігналізуе рад фактаў. У многіх раёнах перабудова работы прафсаюзаў праходзіць вельмі марудна. Шмат на якіх прадпрыемствах яшчэ не арганізаваны выплатныя пункты. Шмат дзе затрымліваецца выплата пропай па часовай непрацаздольнасці. У тым-жа Аршанскім раёне выкрыты факты, калі рабочых пасылаюць за 20 клм. у раён для афармлення дакументаў на хваробе.

Сігнал з Оршы павінен выклікаць масавую праверку з боку партыйных арганізацый — як практычна ажыццяўляецца дырэктыва ўрада аб зліцці органаў працы і сацстраха з прафсаюзамі. Сабатажнікі зліцця павінны атрымаць адпор.

Менгарком КП(б)Б паведамляе, што 19-га кастрычніка а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканні Дома комасветы (пакой № 12, уваход з вул. Энгельса) склікаецца нарада жаноргаў прадпрыемстваў і ўстаноў, а таксама наступных таварышоў:

САЛДАЦЕНКА (гарКК), ШТРАЛЬ (ГК КП(б)Б), ШАПІРА, СЯМЁНАВА («Работніца і калгасніца»), ПОТАШ, ЛІУШЫЦ (Дом комасветы), РУБЕНЧЫК (гарКК КП(б)Б), РУТМАН (Саюздрук), ЕРМОЛАВА, КУЛЬБАК (Наркамшляхпрам), ТУР (ЦС АСО), РАСТОЎСКАЯ, РОЗЕНБЕРГ (Металлаб'яднанне), ЛЕРНЕР (Белкаапсаюз), ГЕЛЬФМАН (гарКК КП(б)Б), ФАРБЕР (Белкаапсаюз), ШУСЕР (Наркамэховы здароўя), ПАЦЕХІНА (гарком кааперацыі і гандля), АКСЕЛЬРОД (дзіцячая сталоўка № 2), ДЗЕМІДОВІЧ (ЦВК), БАРАНОЎСКАЯ (гарадзел аховы здароўя), АКСЕЛЬРОД Д. (ГК КП(б)Б), ЗАРЭЦКАЯ (Наркамзем), ГУДЗІНА (Наркамасветы), ЭПШТЭЙН («Работніца і калгасніца»), САГАЛОВІЧ (Наргасупік).

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

На бягучым рахунку 1.025.035 руб.

За 16 і 17 кастрычніка на бягучы рахунак Дзяржбанка № 160-7814 паступіла 13.433 руб. Ад арганізацый і ўстаноў гор. **Менска**—1.249 руб. Паступіла з раёнаў: **Магілеўскага** — 5.134 руб., **Барысаўскага**—3.500 р., **Быхаўскага**—1.049 руб., **Буда-Кашалеўскага**—992 руб., **Мсціслаўскага**—466 руб., **Мазырскага**—400 руб., **Жлобінскага**—401 руб. і **Суражскага** — 239 руб.

З пачатку збора на бягучы рахунак Дзяржбанка паступіла 1.025.035 руб.

Уносяць і выклікаюць

✦ На выклік тав. **Чакунова** ўпошту 25 рублёў у фонд пабудовы авіяэскадрыльлі імя т. Кагановіча і выклікаю наступных т. т.: **Гейне** (дырэктар Гарадоцкай МТС); **Барадуліна** (дырэктар Суражскай МТС); **Кавалёва** (Галоўн. гар. міліцыі); **Таненбаума** (гом. аддз. Прамбанка); **Шэймана** (гом. аддз. Белгандля); **Кацнельсона, Піпкіна, Вайнштэйна, Співак** (Наркамшляхпрам); **Сліўкіна, Рабіновіча Л.** (вецкаўскі РВК); **Берговіна** (клімовіцкая райКК-РСІ); **Дзейна** (жлобінская райКК-РСІ); **Арыдта** (Белдзяржпаб); **Барана** (БІМЗО); **Эпштэйна Л.** (ЦК КП(б)Б); **Качаноўскага** (палітаддзел Рагачоўскай МТС); **Валюкевіча** (старшыня лёзненскага РВК); **Міцькова** (сакратар лёзненскага РК); **Пад'ельца** (лёзненскае ДПУ); **Шульга** (лёзненскае аддз. Дзяржбанка); **Данцыгера, Станішэўскага, Галле, Табачнікаву** (палітаддзел лепельскай МТС).

Нартыш-Блук.

✦ Работнікі Людзяленіцкай цагельнай артэлі «Прымежны цагельнік», Жыткавіцкага раёна, унеслі на пабудову эскадрыльлі імя т. Кагановіча 65 руб. і выклікаюць пасляваць іх прыкладу ўсе артэлі Белкаапшрамсовета. Збор сродкаў працягваецца.

Эпштэйн.

✦ Калгаснікі калгаса імя т. Сталіна, Весніцкага с-совета, Ушацкага раёна, унеслі 50 рублёў на пабудову авіяэскадрыльлі імя т. Кагановіча і выклікалі на сацспаборніцтва ўсіх калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў сельсовета.

✦ На выклік калгаснікаў калгаса імя т. Сталіна ўнёс 70 руб. у фонд пабудовы эскадрыльлі калгас «Чырвоная Лясіны» (Ушацкі раён).

✦ Падабранскі с.-с., Церахоўскага раёна, унёс на пабудову эскадрыльлі імя т. Кагановіча 180 рублёў і выклікаў пасляваць яго прыкладу Марканіці, Пракопаўскі і Церахаўскі сельсоветы.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Рэспубліканская камісія па чыстцы паведамляе, што 20 кастрычніка г. г., у 10 гадз. ран., у м. Капыле будзе засядаць рэспубліканская камісія па чыстцы па разгляду апеляцый па пастанове капыльскай раённай камісіі па чыстцы наступных таварышоў:

Бірыча Р. С., Алешкі А. Б., Голанд Е. Р., Ксёнжыка З. Ф., Мірошнікавай З. А., Ламакіна В. Т., Федаровіча М. С., Дударова С. П., Кота В. С., Галоціка П. С., Берковіча П. І., Астрэйка Н. В., Барысевіча С. А., Будкевіча В. В., Бойка Н. Б., Былінсвіча А. М., Вараб'я М. В., Ярмолава А. М., Зяневіча І. Ь, Зянковіча Э. А., Капціповіча Ф. Н., Катла Е. С., Ніжэвіча А. І., Наруцэ І. Т., Лойка І. Т., Кунцэвіча І. В., Макарчука І. Я., Лабацэвіча І. М., Лушчыцкага В. Н., Міхайлава В. І., Макарэвіча А. І., Піната І. У., Сохнай П. П., Слагуба С. Т., Сачко Н. С., Татура М. Г., Граяноўскага А. Ф., Тупіцы І. Я., Хапытончыка І. Н., Яўсейчыка І. Г., Царлюкевіча М. Ф., Самоціка В. Д., Самоціка С. Д., Сакалоўскага Л. Е.

Рэспубл. камісія па чыстцы.
КП(б)Б.

ПК ЦКК КП(б)Б просіць т. **Пенціна Міхопу Гаўрылава**, праживаўшага раней у Касцюковіцкім раёне, паведаміць ПК ЦКК (Менск, Совецкая, 55) адрас або месца работы і жыхарства без выезда ў Менск.

Просьба да ўсіх партарганізацый, ведаючых аб месцы знаходжання пазначанага таварыша паведаміць аб гэтым ПК ЦКК.

Пам. секратара ПК ЦКК КП(б)Б
ПАЛЕЙ.

19 кастрычніка на чыстцы яч. КП(б)Б газеты „Звязда" персанальную чыстку праходзяць

т. т. Вальфсон, Мароз, Ястрэмскі, Ліманоўскі, Паляшчук, Рабцэвіч, Левін А., Додзін, Дрыкер, Кручкоў.

20-га кастрычніка персанальную чыстку праходзяць **т, т. Цыпіна, Чарнякоў, Шапіра, Эпштэйн, Эстрын, Ермакоў, Гохман, Рольбін, Дзерах**

Чыстка адбываецца **ў памяшканні Дома пісьменнікаў** (Совецкая вул., № 68) з 9 гадз. раніцы да 1 гадз. дня.

Рабкоры, рабочыя і працоўныя Менска запрашаюцца прыняць актыўны ўдзел у чыстцы.

Камісія па чыстцы.

Менскі гарком КП(б)Б і гарадская камісія па чыстцы партарганізацый

склікаюць

18 кастрычніка 1933 года а 7 г. веч. у Доме комасветы (б. клуб. імя К. Маркса)

ГАРАДСКУЮ КАНФЕРЭНЦЫЮ

групапартарганізатараў і сакратароў цэхпарт'ячэек вытворчых калектываў па пытанню аб замацаванні вывадаў камісій па чыстцы.

Сакратары парткалектываў і ячэек атрымліваюць мандаты для сакратароў цэхпарт'ячэек і групарторгаў па прадстаўленню пуцёвак па форме, раздаўшы аргаддзелам ГК.

Мандаты выдаюцца 18 кастрычніка з 10 да 1 гадзіны дня і ад 6 да 10 гадзін вечара ў гаркоме, пакой № 46.

Менскі ГК КП(б)Б
Гаркамісія па чыстцы партарганізацый.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

„Чырвоная Зірка" Каса—ад 1 г. дня. Гукавы мастацкі фільм **2 СУСТРЭЧЫ**

Кіно Інтэрнацыянал **КВЕТКА КАХАННЯ**

Кіно „Пролетарый" Мастацкі совецкі фільм **Цана чалавека** драма ў 6 частках

Дзіцячы гукавы кіно-тэатр **ДВА ДРУГА** **МАДЭЛЬ і ПАДРУГА** камедыя ў 7 частках

Кіно „СПАРТАК" З 19 кастрычніка усходні мастацкі фільм **ПЕРШАЕ І АПОШНЯЕ** драма ў 7-мі частках. Каса з 4-х гадзін дня.

БЕЛАРУСКІ РАБОЧЫ ТЭАТР „САУГАСРАБОЧЫ" АБВЯШЧАЕ НАБОР АКТОРАЎ

Заявы і дакументы прымаюцца ў клубе харчавікоў ад 12—2 і ад 4—6 гадз. іспыты адбудуцца 20 кастрычніка ў клубе харчавікоў у 6 гадз. вечара

Дырэкцыя.

НАВУЧАЛЬНЫ КАМБІНАТ Беларддзялення „СОЮЗОРГУЧЕТ" арганізуе **5-месячную групу** па падрыхтоўцы **СТАРШЫХ БУХГАЛТАРОЎ для сістэмы Наркамснаба БССР.**

Стыпендыя ад 125 да 175 руб. і натэрных 25 руб. у мес. інтэрнатам курсанты не забяспечваюцца.

Прымаюцца бухгальтары, памбухі або рахункаводы не менш як з 2-гадовым рахунковым стажам па падвойнай бухгальтарскай сістэме.

Заявы з дакумантамі: аб саастановішчы і паходжанні, аб адукацыі (не менш 7-мі груп), аб узросце (не менш 18 г.), аб адносінах да вайсковай павінасці, аб стажы і аб вызваленні ад апошняга месца работы прымаюцца ў канцылярыі навучальнага камбіната „Союзоргучета"—Менск, Міхайлаўская, 1-4, ад 7 да 10 гадз. веч. і ў Бел. аддз. „Союзоргучет"-Менск, Комуністычная 16, ад 10 да 12 гадз. дня.

Прыём заяў да 25 кастрычніка г. г. Заявы без усіх пералічаных дакумантаў разглядацца не будуць.

Навучальны камбінат „СОЮЗОРГУЧЕТ".

ДА ЎВАГІ ЎСІХ НАРКАМАТАЎ і ЦЭНТРАЛЬНЫХ УСТАНОЎ

ДЗЯРЖПЛАН БССР даводзіць да ведама, што наркаматы і ўстановы

не прадставіўшыя планаў на 1934 год

па формах і ў тэрміны, устаноўленых Дзяржпланам,

не будуць уключаны ў заяўкі на будматэрыялы і фонды зарплаты.

Дзяржплан звяртае ўвагу ўсіх арганізацый на неабходнасць прадстаўлення ўсіх вестак **не пазней 25 кастрычніка г. г.**

У матэрыялах безумоўна павінна быць забяспечана прадстаўленне разлікаў па якасных паказальніках працы і зарплаце і патрэбнасці будматэрыялаў.

Нам. старшыні Дзяржплана БССР ЧОРНЫ

НЕ ЧАКАЙЦЕ апошніх дзён ПАДПІСКІ

НА ГАЗЕТЫ:
„ЗВЯЗДА" Орган ЦК і Мен. ГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР
„ОРКА" (на польскай мове) Орган ЦК КП(б)Б.
„РАЎДОНАСІС АРТОЯС" (на літоўскай мове) Орган ЦК КП(б)Б

НА ЧАСОПІСЫ:
„БОЛЬШЗВІК БЕЛАРУСІ" Орган ЦК КП(б)Б.
„БОЛЬШЗВІЦКІ ДРУК" Часопіс культарпа ЦК КП(б)Б.
„Работніца і калгасніца БССР" Выдавецтва ЦК КП(б)Б.

ПАМЯТАЙЦЕ, ШТО СВАЧАСОВАЯ ЗДАЧА ПАДПІСКІ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ЛЕПШАЙ ГАРАНТЫЯЙ АКУРАТНАЙ ДАСТАЎКІ ГАЗЕТ І ЧАСОПІСАЎ

Апошні тэрмін прыёма падпіскі на лістапад—26 кастрычніка.

Пасля гэтага тэрміна падпіска ні ў якім разе прымацца не будзе.

СПЯШЫЦЕ ПАДПІСАЦЦА!

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: **МЕНГАРБЮРО САЮЗДРУКУ** (Ленінскі, 34, другі паверх) у гарадох—**ГАРБЮРО САЮЗДРУКУ** і раёнах—**РАЙБЮРО САЮЗДРУКУ.** Таксама тыражныя работнікамі саюздруку, лістаносцамі, якія маюць на гэта пасведчанне і ўсімі кіёскамі па продажы газет.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР ЮНАГА ГЛЕДАЧА абвяшчае прыём акторaў

як з прафесіянальных тэатраў, так і з мастацкіх самадзейных гурткоў.

Прымаюцца мужчыны і жанчыны ва ўзросце ад 16 да 35 год. з адукацыяй ня ніжэй семігодкі, маючыя адпаведныя здольнасці навыкі сцэнічнай працы.

Заявы прымаюцца да 1 лістапада г. г.

Для паступлення неабходны наступныя дакументы: аб саастановішчы, аб адукацыі, характарыстыка аб грамадскай рабоце.

Да іспыта падрыхтаваць апавяданне, байку, верш.

Адрас: Менск, Совецкая вул., памяшканне польскага тэатра, БелТЮГа.

Бабруйская школа ФЗВ лесакамбіната

абвяшчае набор вучняў на 1933-34 навуч. год у ліку 120-ч. У школу прымаюцца дзеці рабочых, служачых, калгаснікаў і ў першую чаргу ўдарнікаў дрэваапрацоўчай прамысловасці, пераважна з скончыўшых семігадовую школу, але не ніжэй 5-ці груп, ва ўзросце не ніжэй 16 год. Усе прынятыя забяспечваюцца інтэрнатам: харчовае забеспячэнне па 1 спісу I кат.; зарплата на паспяховасці пры школе ёсць сталоўка.

Да заяў трэба дадаць наступныя дакументы: аб адукацыі, аб нарадзінні, аб саад. становішчы. Заявы і дакументы накіраваць у канцылярыю школы да 25 кастрычніка 1933 г. па адрасу: г. Бабруйск, ласакамбінат, школа ФЗВ. Пададзеныя дакументы з'явіцца 25, 27 і 28 кастрычніка 1933 г. Заняткі пачнуцца 1 лістапада 1933 г.

Дырэкцыя.

ВІЦЕБСКІ ПЕДІНСТЫТУТ працягвае **да 25-га кастрычніка прыём заяў на завочны сектар**

на аддзяленні: матэматычнае, фізычнае, хімічнае і біялагічнае.

У гэтым годзе завочнікі могуць таксама залічвацца і толькі на асобных дысцыплінах або цікавіць дысцыплін па сваёй спецыяльнасці (матэматыка, фізыка, хімія, біялогія).

Акрамя гэтага абвяшчаецца **студэнцкі набор у дзенны інстытут.** Падача заяў да 15 снежня. Адрас інстытута: Віцебск, Пушкінская вул. № 3.

Дырэкцыя.

У аддзел аб'яў званіце па тэлефону 21-360

Праверком і бюро парт. ячэйкі Белжылсаюза паведамляе, што **15-X—1933 г. ПАЧАЛАСЯ ЧЫСТКА ПАРТ'ЯЧЭЙКІ БЕЛЖЫЛСАЮЗА І БЕЛЖЫЛСТАНДАРТ ТРЭСТА.**

Запрашаюцца рабочыя і служачыя прадпрыемстваў і ўстаноў, а таксама працаўнікі і актывісты ЖАКТаў і ЖБКТ.

Чыстка праходзіць у клубе будаўнікоў (вул. Энгельса № 18).

Праверком.
Бюро ячэйкі.

Беларддзяленне ДАМЭЦ

даводзіць да ведама ўсіх фабкомаў, фабзаўмтсцкомаў, мясцкомаў і іншых зацікаўленых арганізацый, што

з 15 кастрычніка г.г. прымаюцца заяўкі

на прадмет абслугоўвання кастрычніцкіх дзён канцэртна-эстрадныя сілы артыстаў ДАМЭЦ.

Пры падпісанні дагавора вышэйуказаныя арганізацыі павінны даць сваім прадстаўнікам даверанасці на права падпісання дагавора.

Заяўкі прымаюцца штодзенна, з 11 г. ран. да 4-х дня, у ДАМЭЦ. (Універсітэцкая, 12, клуб металістаў тэл. 22-755).

БелДАМЭЦ.

ГОС. ХИМ.-ФАРМ. ЗАВОД „ФАРМАКОН" ЛЕНИНГРАД

СПЕРМИН-ЦЕЛЮ

КЛИНИЧЕСКИ ИСПЫТАН и ПРИМЕНЯЕТСЯ в ТЕЧЕНИИ 30 ЛЕТ

при неврастении, половом бессилии, старческой слабости, артериосклерозе и малокровии

ПРОДАЖА во всех аптеках и магазинах САНИТАРИИ и ГИГИЕНЫ С. С. С. Р.

ИМЕЮТСЯ ТАКЖЕ В ПРОДАЖЕ: ОБАРИН, МАМИН, ПЕПТОН, ФОЛИКУЛЕН, ПИТУИТРИН, ТИМОФИЗИН, АСТМОЛИЗИН, ТИРЕОИДИН

ТАБЛІЦА

21-га тыража выйгрышаў пазыкі „3-га рашаючага года пяцігодкі" (бяспроцантна-бяспройгрышнага выпуска)

Тыраж выйгрышаў праводзіўся ў гор. Варонежы 10 і 11 кастрычніка 1933 г.

№№ серый	№№ аблігацый	сума выйгрышаў	№№ серый	№№ аблігацый	сума выйгрышаў
0210	1—100	50	5449	91*)	200
0383	99*)	200	5837	50*)	200
0473	20*)	500	6002	71*)	200
0596	05*)	200	6123	1—100	50
1103	71*)	500	6157	04*)	200
1634	96*)	200	6190	86*)	500
1674	98*)	200	6486	89*)	500
1707